НЯ СПЫНЯЦЬ ІЛЬНЯНОГА КАНВЭЕРУ!

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 273 (4179)
Серада, 7 лістрычніка 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

Пад'ём ільнатрасты са сьцелішч, работа сушылак і мяльных пунктаў павінны праходзіць бесьперапынна

Неадкладна разаслаць рэшткі ільнасаломы, убраць усе канопліі. Складаньнем рабочых плянаў, арганізацыяй сацспаборніцтва і ўдарніцтва,—сваячасова апрацуем і здамо ільнавалакно дзяржаве

У той час, як 65 раёнаў ужо даўно скончылі церабленьне ільну і значная частка з іх заканчвае першапачатковую апрацоўку, 10 раёнаў расьцягнулі тэрміны церабленьня да сёньняшняга дня. **У Бабруйскім, Старадарожскім, Чырвонаслабодзкім, Бягомльскім, Лагойскім, Чэрыкаўскім, Аршанскім, Дубровенскім і Сураскім** раёнах яшчэ стаіць на корані ад 17 да 6 проц. ільну, што складае па рэспубліцы 2,6 проц. да пляну ўсёй плошчы, засеянай ільном.

Чаго варты тэмпы работы ў Старадарожскім раёне, дзе пасеяна ўсяго 1242 гэктары ільну, а на сёньняшні дзень выцеравана толькі 83,2 проц. пляну. У той жа час, Гарадоцкі раён, які пасеяў 13.238 гэктараў, ужо на 5 верасьня выцерабіў 99,3 проц. пляну. Параўнаньне гэтых двух раёнаў дазваляе зрабіць толькі адзін вывад, што як у Старадарожскім, так і ў іншых 9-ці раёнах працягваецца ігнараваньне ільну, як важнейшай тэхкультуры, што работнікі некаторых раёнаў, якія ў часе веснавой сяўбы ўсімі мерамі імкнуліся выжыць лён, паколькі іх раёнам вызначан жывёлагадоўча-бульбяны, або садова-гародны напрамак,—працягваюць барацьбу супроць ільну. Як бачым, гэтыя шкодныя настроі канчаткова ня зжыты. Той факт, што ў 10-ці раёнах да гэтага часу на полі стаіць 2,6 проц. ільну, нельга інакш разглядаць, як яўнае ігнараваньне простых і катэгарычных дырэктыў партыі.

Супраціўленьню апартуністаў і неждаваньне мабілізаваць масы вакол пастаўленай партыяй праблемы тэхкультур павінен быць нанесен руйнуючы ўдар. Трэба ў бліжэйшыя-ж дні скончыць церабленьне ільну.

Першапачатковая апрацоўка ільну (абмалот, мочка і расьціл) пачалася пры актыўным удзеле мас калгасьнікаў. Па рэспубліцы асноўная маса выцераблена ільну абмалочана (93,7 проц.) і разаслана (90,8 проц.). Па 29-ці раёнах увесь выцераблены лён абмалочан і разасланы. Асаблівую ролю ў гэтай рабоце адыграла арганізацыя сацспаборніцтва і ільнянота канвэеру на Уборцы і першапачатковай апрацоўцы ільну.

Аднак, дзе-ні-дзе, узрадаваўшыся пасьпяховаму ходу ўборкі і пераапрацоўкі, раённыя арганізацыі аслабілі ўвагу да першапачатковай апрацоўкі ільну.

У апошнія дні па некаторых раёнах намецілася разрыў паміж абмалотам ільну і расьцілам.

Гэты факт прымушае ўсе арганізацыі зьвярнуць асаблівую ўвагу і не дапусьціць ніякага аслабленьня апрацоўкі ільну. Увесь абмалочаны лён павінен **неадкладна паступаць на сьцелішчы.** Нельга ні ў якім разе спадзявацца на самацёк і недаацэньваць складанасьці работы па завяршэньні ўсіх працэсаў апрацоўкі ільну, ад правядзеньня якіх залежыць сваячасная здача сацыялістычнай прамысловасьці добраякаснага ільнаволакна.

Калі ў ходзе ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну мы маем у асноўным здавальняючае становішча, дык гэтага нельга сказаць аб ходзе ўборкі і апрацоўкі **канапель.** На 30 верасьня выцераблена канапель толькі 64,3 проц., абмалочана 40,8 проц., а разаслана толькі палова выцераблених канапель.

«Зьвязда» ўжо ня раз пісала аб неабходнасьці самай рашучай барацьбы з недаацэнкай канапель, барацьбы з поглядамі на канопліі, як на другарадную культуру. Усё-ж, як мы бачым, гэтыя ўказальні ня ўлічаны і 35 проц. пасеву канапель стаіць на корані. Тэрміны ўборкі ўжо даўно прайшлі і далейшая зацяжка пагражае стратамі капітоўнейшай культуры. У сувязі з гэтым перад усімі пізавымі і раённымі арганізацыямі паўстае баявая задача— **ў бліжэйшыя дні ўбраць, абмалаціць і разаслаць усе канопліі.**

Адначасова неабходна павесьці рашучую барацьбу супроць самацёчных настрояў у справе над'ёму ільнатрасты і арганізацыі работ на апрацоўцы ільнавалакна. Значная частка ільнатрасты ўжо гатова да апрацоўкі і яна павінна паступаць на мяльна-сушыльныя пункты. Аднак, складаньне рабочых плянаў па апрацоўцы ільнавалакна (сушка, трапаньне, мяцьцё), арганізацыя брыгад па над'ёме і апрацоўцы, уся гэта работа не праводзіцца належнымі тэмпамі. Тут складаецца патроза нерарыўнае канвэеру, арганізаванага на ільняных палёх.

ЗАДАЧА раённых арганізацый **не дапусьціць** перарываньня канвэеру, а **ЗАМАЦАВАЦЬ** гэту форму арганізацыі працы і наладзіць бесьперапынную работу паміж сьцелішчамі, сушылкамі і мяльнымі пунктамі, поўнасьцю натрузіць мялкі і сушылкі, **ПЕРАВЕСЬЦІ УСЕ РАБОТЫ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ,** арганізаваць сацспаборніцтва, шырока практыкаваць прэміяваньне ўдарнікаў.

АСАБЛІВУЮ РОЛЮ у падняцьці прадукцыйнасьці працы па пераапрацоўцы ільнавалакна павінна адыграць алошняя пастанова НКЗБ і Белкалгасцэнтру аб пераважнай ацэнцы работ мяльнічыкаў, сушыльнічыкаў і трапальшчыкаў. У адным з пунктаў гэтай пастановы сказана наступнае:

«3. Улічваючы адказнасьць работы па сушцы, цяжкасьць работы па мяцьці, а па трапаньні, апрача таго, неабходнасьці навыку ў рабоце, павысіць расцэнкі ў працаднёх за сушку, мяцьцё і трапаньне ільну і канапель прыкладна на 20 проц. супроць расцэнак работ па церабленьні.

4. Калгасьнікам і калгасьніцам, якія сушылі, мялі і трапалі лён, павінна быць прадана ня менш паловы ўсіх прамтавараў, якія калгас атрымлівае пры здачы валакна прычым разьмеркаваньне прамтавараў паміж гэтымі калгасьнікамі павінна праводзіцца ў адпаведнасьці з колькасьцю выпрацаваных працадзён».

Трэба дабіцца, каб гэта пастанова была даведзена да кожнага калгасьніка і ажыцьцёўлена.

Рашучай барацьбой з кулаком і яго агентамі — апартуністамі, шырокай мабілізацыяй мас калгасьнікаў і адзіначасовнікаў, разгортваньнем паміж калгасамі і вёскамі ўзаемадапамогі,—з поспехам завяршым апошні этап барацьбы за лён і сваячасова забясьпечым сацыялістычную прамысловасьць сырцо-

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе ўборкі, абмалоту ільну і канапель па раёнах БССР на 30 верасьня без саўгасаў

Назва раёнаў	З ліку выцераблена				З ліку убранага		
	Выцераблена ільну ў проц.	Абмалочана і вочана ў проц.	Пасланa і замочана	Убрана канапель ў проц.	Абмалочана ў проц.	Вісланa і замочана ў проц.	Падрыхтавана мяльна-трэпальных і т. п.
Брагінскі	100,0	100,0	100,0	100,0	—	—	—
Б.-Кашалёўскі	100,0	95,1	95,1	—	—	—	—
Бабруйскі	93,0	99,3	98,1	100,0	100,0	100,0	—
Веткаўскі	100,0	100,0	100,0	—	—	—	—
Глускі	100,0	95,1	95,1	—	—	—	—
Гомельскі	100,0	100,0	100,0	90,0	100,0	76,2	—
Жыткавіцкі	100,0	99,4	99,4	86,8	85,7	85,7	—
Жлобінскі	100,0	100,0	100,0	88,7	11,3	—	—
Кармянскі	100,0	100,0	96,4	—	—	—	—
Камарынскі	100,0	92,3	92,3	100,0	88,0	57,7	1
Лоеўскі	100,0	100,0	100,0	59,1	63,0	61,8	—
Любаньскі	100,0	96,3	96,3	100,0	23,4	23,4	—
Лельчыцкі	100,0	92,6	92,6	56,9	—	—	—
Мазырскі	100,0	100,0	100,0	100,0	—	—	—
Нараўлянскі	100,0	100,0	55,3	47,4	100,0	100,0	—
Парыцкі	100,0	90,4	90,4	18,1	—	—	—
Пятрыкоўскі	100,0	100,0	100,0	48,1	71,5	71,5	—
Рагачоўскі	100,0	100,0	99,7	100,0	100,0	100,0	—
Рэчыцкі	100,0	97,5	76,4	100,0	—	—	—
Слуцкі	100,0	100,0	100,0	79,5	12,9	12,9	1
Старобінскі	100,0	100,0	100,0	100,0	11,4	11,4	—
Ст.-Дарожскі	83,2	65,2	65,2	62,6	67,8	18,4	—
Тураўскі	100,0	97,8	96,1	93,9	97,1	94,2	—
Церахаўскі	100,0	100,0	100,0	25,2	51,0	51,0	—
Чачэрскі	100,0	100,0	100,0	75,7	—	—	—
Чыр.-Слабодзкі	94,6	81,0	70,0	41,4	63,9	63,9	—
Ўраравіцкі	100,0	58,0	50,1	7,8	8,3	8,3	—
Хойніцкі	100,0	98,5	98,5	100,0	92,1	92,1	—
Быхаўскі	100,0	100,0	100,0	—	—	—	—
Барысаўскі	100,0	75,7	68,3	15,5	21,9	—	—
Бялыніцкі	100,0	93,1	98,1	—	—	—	—
Бягомльскі	88,1	45,4	45,4	100,0	76,5	57,7	—
Бярэзінскі	100,0	100,0	100,0	100,0	99,5	65,4	—
Горацкі	100,0	85,8	83,6	44,8	55,7	15,7	—
Клімавіцкі	100,0	81,1	73,5	31,5	—	—	—
Крупскі	100,0	100,0	100,0	100,0	27,0	27,0	—
Капыльскі	100,0	97,8	96,0	91,3	66,7	61,9	—
Касьцюковіцкі	100,0	100,0	100,0	57,2	100,0	46,2	—
Клічаўскі	100,0	100,0	100,0	36,8	—	—	—
Койданаўскі	100,0	81,1	71,5	50,6	32,6	11,2	—
Крычаўскі	100,0	89,9	89,9	100,0	32,8	26,5	—
Лагойскі	97,0	90,1	84,5	80,4	—	—	—
Магілёўскі	100,0	92,6	89,3	79,1	—	—	—
Мсьціслаўскі	100,0	84,5	83,4	65,8	26,6	—	—
Менскі	100,0	0,9	—	8,1	—	—	—
Прапойскі	100,0	98,4	89,3	81,1	5,2	—	—
Пухавіцкі	100,0	100,0	100,0	52,8	47,1	32,7	—
Плешчаніцкі	100,0	71,4	65,5	52,1	11,0	9,6	—
Талачынскі	100,0	75,5	76,5	100,0	4,9	44,9	—
Чэрвеньскі	100,0	97,7	96,8	100,0	94,2	45,5	—
Чавускі	100,0	99,4	97,9	76,0	39,3	8,0	—
Чэрыкаўскі	88,1	93,9	83,2	44,6	0,5	0,5	—
Шклоўскі	100,0	96,7	76,4	78,1	93,7	93,6	—
Вуньдзенскі	100,0	94,3	83,3	82,8	—	—	—
Асьвейскі	100,0	100,0	100,0	—	—	—	1
Аршанскі	93,7	97,6	97,6	36,9	—	—	—
Бешанковіцкі	100,0	100,0	100,0	53,0	—	—	—
Віцебскі	100,0	100,0	100,0	—	—	—	—
Вушацкі	100,0	100,0	100,0	97,3	94,8	—	—
Гарадоцкі	100,0	98,5	96,5	100,0	100,0	100,0	—
Дубровенскі	90,1	86,3	85,6	61,2	—	—	—
Дрысенскі	100,0	100,0	100,0	—	—	—	36
Лёзьнянскі	100,0	100,0	100,0	23,1	56,4	2,0	—
Лепельскі	100,0	93,0	92,8	100,0	—	—	—
Полацкі	100,0	96,9	84,1	39,3	100,0	100,0	—
Расонскі	100,0	100,0	100,0	—	—	—	—
Сураскі	96,3	97,7	87,8	27,1	—	—	—
Сеньненскі	100,0	84,4	84,4	88,0	74,0	74,0	—
Сіроцінскі	100,0	97,3	97,3	86,6	—	—	—
Чашніцкі	94,5	78,7	68,9	41,4	22,0	22,0	2
Разам па БССР:	97,4	93,7	90,8	64,3	40,8	31,9	201

Новая фаза інтэрвэнцыі ў Манчжурыі

Падзеі ў Манчжурыі зьявіліся яскравым пацьверджаньнем правільнасьці рашэньняў і дырэктыў XI пленуму ВККІ аб ваеннай небясьпецы. Капіталістычны сьвет напружана шукае выхаду з сусьветнага эканамічнага крызісу. Ён шукае свайго КАПІТАЛІСТЫЧНАГА выхаду, сваімі КАПІТАЛІСТЫЧНЫМІ шляхамі, мэтадамі гвалту і грабяжу працоўных мас, падняволеньня слабейшых дзяржаў больш моцнымі, прыгнечаньня капёніяльных народаў. Побач з напружанай клясавай барацьбой, якая паскорвае нарастаньне рэвалюцыйнага крызісу ў краінах капіталу, разгараецца барацьба паміж самімі імпэрыялістычнымі дзяржавамі, завастраецца становішча ў капёніяльных краінах, дзе націск імпэрыялізму сустракаецца з хваляй нацыянальна-вызваленчых баёў.

Небясьпека вайны становіцца ўсё больш рэальнай, яна можа штодзённа вырасьці з нетраў канфліктаў і перарасьці ў сусьветную крывавую бойню.

КІТАЙ ужо з даўных часоў зьяўляецца адным з важнейшых вузлоў перапляценьня імпэрыялістычных супярэчнасьцяй і адначасова адным з важнейшых ачагоў барацьбы мас супроць панаваньня імпэрыялістаў.

ЯПОНІЯ — адна з галоўных імпэрыялістычных дзяржаў, якая мае інтарэсы на далёкім Усходзе. Яна — як і іншыя капіталістычныя дзяржавы, знаходзіцца ў ціскох крызісу і таксама як і ўсе шукае з яго выхаду мэтадамі капіталістычнага грабяжу і падняволеньня. Узмоцненая эксплёатацыя пралетарыяту, які налічвае сотні тысяч беспрацоўных, масавае рабаваньне бяднейшага сялянства і ўрэшце актывізацыя каленіяльнай палітыкі — вось асноўныя шляхі, якімі японская буржуазія імкнецца выйсьці з крызісу. Карыстаючыся тым, што іншыя імпэрыялістычныя дзяржавы заняты, у першую чаргу, супярэчнасьцямі ў галоўных вузлах эўрапэйскай і эўрапэйска-амэрыканскай палітыкі, Японія старанна і доўгачасова падрыхтавала сваё выступленьне ў Манчжурыі.

Яшчэ ад часоў ЦАРСКА-ЯПОНСКАЙ ВАЙНЫ ў паўднёвай Манчжурыі бескантрольна панавала японская фінансавая алігархія, гаспадарылі японскія капіталістычныя дрэпейнікі, а мясцовы сатрап фэнтычна быў манекенам на токійскай нітачцы. Калі Манчжурыя не зрабілася калёніяй Японіі, ФАРМАЛЬНА, як калісьці КАРЭЯ і ШАНТУНГ, дык гэта тлумачыцца галоўным чынам супраціўленьнем іншых імпэрыялістычных дзяржаў, галоўным чынам Англіі і Злучаных Штатаў, якія не хацелі дапусьціць значнага ўзмацненьня японскай пазыцыі.

Цяпер становішча зьмянілася ў карысьць Японіі такім чынам, што «сообщник» і адначасова канкурэнт яе на далёкім Усходзе — Англія апынулася ў вельмі цяжкім становішчы, у выніку ўзьнікшага хвалі вызваленчай барацьбы ў розных кутніх сусьветнай імпэрыі, а галоўнае, у выніку эканамічнага і фінансава-крэдытнага крызісу. Адначасова спрыяючым для Японіі зьяўлялася тое, што Амэрыка, каб выратаваць свае палітычныя і эканамічныя пазыцыі, каб выратаваць капіталістычную сыстэму, як такавую, павярнулася «тварам да Эўропы» і прымушана была шчыльна падыйсьці да эўрапэйскіх спраў.

Аб разгортваньні падзей у Манчжурыі, аб апошнім ходзе іх, ужо шмат пісалася. Ішлі яны старымі выпрабаванымі рацэптамі: правакацыя, забойства, ваенная інтэрвэнцыя і г. д. Усё гэта адбывалася ў атмасфэры магільнага маўчаньня ў лягеры імпэрыялістаў. Не гаворачы ўжо пра Англію, нават Амэрыка, якая стаяла на пазыцыі нібы-та ўтрыманьня цэласьці Кітаю, (каб пашырыць сфэру сваіх уплываў на ЎВЕСЬ Кітай), нават Амэрыка ня выступіла ў першай фазе японскага наступленьня. Ліга Нацый, да якой зьвярнуліся з пратэстам прадстаўнікі «нацыянальнага» ўраду з Нанкіну, як і можна было чакаць ад гэтага зборышча разбойнікаў, стала на пазыцыю Пілата, умываючы рукі і адмаўляючыся ад умяшальніцтва. Гэта, між іншым, паказвае паспабленьне пазыцый Англіі, якая ня можа зараз адважыцца абараняць стан свайго ўпаданьня ў Кітаі. У далейшым разьвіцьці падзей пёрд Сэсіль рашуча падтрымаў японскі імпэрыялізм.

Гэта значыць, што фактычна ўвесь капіталістычны сьвет падтрымлівае Японію. Амэрыка парашыла ўмяшацца ў манчжурскія справы тады, калі Японія, па яе думцы, пойдзе занадта далёка. Ня маючы магчымасьці пратэставаць загадзя супроць японскага выступленьня, Злучаныя Штаты спрабуюць яго абмяжаваць. Дэклярацыя Стымсона, якая складаецца з вельмі неясных і агульных фраз, якая ў кожным радку спасылаецца на Пакт Келога і на «микролюбие» Амэрыкі, зьяўляецца ўсё-ж такі вельмі выразнай ПЕРАСЬЦЯРОГАЙ Японіі. Японія пайшла на некаторыя дробныя фармальныя ўступкі, адазваўшы частку свайго экспэдыцыйнага корпусу.

Але гэтыя ўступкі чыста ФАРМАЛЬНАГА характару. Японія робіць усё, каб ня выпусьціць з рук, каб не аслабіць тых пазыцый, якія ёй дапо ў рукі апошняе імпэрыялістычнае выступленьне. Гэтым трэба вытлумачыць стварэньне ў акупаваных прэвінцыях «незалежных» урадаў, а фактычна МАРЫЯНЭТАК Японіі.

У сувязі з гэтым паглыбляецца барацьба імпэрыялістычных супярэчнасьцяй на далёкім Усходзе, завастраецца барацьба паміж асноўнымі сіламі імпэрыялізму за Кітай, узмацняецца НЕБЯСЬПЕКА ВАЙНЫ. Адначасова ў Кітаі ўзьнімаецца магутны ўздым нацыянальна-вызваленчай барацьбы супроць імпэрыялістаў і супроць іх «нацыянальнай» гоміндананўскай агентуры. Увесь Кітай ахоплен антыімпэрыялістычнымі выступленьнямі. Мільённыя масы ўцягваюцца ў гэты рух.

Сілы міжнароднага імпэрыялізму і іх перадавы атрад сацыял-фашызм імкнуцца выкарыстаць падзеі на далёкім Усходзе з мэтай ПАДРЫХТОЎКІ АНТЫСАВЕЦКАЙ ІНТЭРВЭНЦЫІ Напрыклад, лейб-орган нямецкіх сацыял-фашыстаў «Форвэртс», малюючы далейшыя пэрспэктывы разгортваньня падзей у Манчжурыі, спрабуе ашукаць працоўныя масы сьцьвярджэньнем, што нібы Савецкі Саюз уцягваецца ў вайну на далёкім Усходзе. Падобныя правакацыйныя чуткі распаўсюджваюць і іншыя органы буржуазнай і «сацыялістычнай» рэакцыі.

Але гэтая НОВАЯ АНТЫСАВЕЦКАЯ БРАХНЯ ня зможа ашукаць шырокія масы працоўных, якія на падставе шматлікіх фактаў пераканаліся ў тым, што непахісны асновай міжнароднай палітыкі Савецкага Саюзу — ГЭТА БАРАЦЬБА ЗА МІР — супроць імпэрыялізму і яго палітыкі. Яны ведаюць, што вінаватых у інтэрвэнцыі Манчжурыі, што падпальшчыкаў вайны трэба шукаць у лягеры імпэрыялістаў. Разам з працоўнымі масамі Манчжурыі і Кітаю ў агульных радох з працоўнымі Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету яны змагаюцца і будуць змагацца супроць імпэрыялістычнага грабяжу, супроць небясьпекі войн, супроць нападу на краіну сацыялізму.

„Разгарнуць узмоцненую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў" (ЦК УсеКП(б)

ЗАМАЦУЕМ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ

разьмеркаваньнем даходаў па працаднёх

Усяго калгасаў на 1-га кастрычніка	Пераведзена на зьдзельшчыну	Забясьпечаны працкніжкамі
10.093	8.596	8.082

Паводле вестак Наркамзему БССР, на 1 кастрычніка пераведзена на зьдзельшчыну 85,8 проц. калгасаў, забясьпечана працоўнымі кніжкамі 80,6 проц., вядуць рэгулярны запіс працадзён 68 проц. У параўнаньні з мінулай дэкадай прырост калгасаў, якія пераведзены на зьдзельшчыну—0,8 проц., забясьпечаных кніжкамі—2,6 проц., вядуць рэгулярны запіс працадзён—2 проц.

Куды горш справа з улікам колькасьці і якасьці працы—на сёньняшні дзень 3.278 калгасаў з 10.093 не вядуць рэгулярнага запісу працадзён. Асабліва ганебна адстаюць раёны: АСЬВЕЙСКІ з 62-х калгасаў вядуць рэгулярны запіс толькі 7, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ са 110—12, ПАРЫЦКІ са 126—12, ТУРАЎСКІ з 33—6, ГЛУСКІ са 126—75, БЕШАНКОВІЦКІ з 255—117 і г. д. Бяз уліку няма сапраўднай зьдзельшчыны, адсутнасьць даходнага ўліку прыводзіць да ўранілаўкі ў разьмеркаваньні даходаў.

Чым-жа тлумачыць такія марудныя тэмпы? Зразумела, што тут справа не ў «абектыўных» прычынах. У адстаючых у гэтым напрамку раёнах існуе апартуністычная недаацэнка зьдзельшчыны і ўліку. Вакол зьдзельшчыны і ўліку не мабілізавана грамадзкая думка, не скарыстаны агранамічны і рахунковы пэрсанал, камсамольцы, настаўнікі, якія-б канкрэтна дапамаглі кожнаму калгасу ўвесьці зьдзельшчыну, нападзіць улік.

Мы патрабуем ад Калгасцэнтру прыцягнуць да адказнасьці канкрэтных носьбітаў зла, прымусіць райкалгасаюзы тэрмінова ліквідаваць прарывы.

Калгасная маса зразумела ўсю перавагу зьдзельнай работы, КАЛГАСЬНІКІ ПАСАБЛІВА КАЛГАСЬНІЦЫ АКТЫЎНА ЎЗЯЛІСЯ ЗА ЎКАРАНЕНЬНЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ ВА ЎСІХ ВІДАХ РАБОТ. ТОЛЬКІ ЗЬДЗЕЛЬНАЯ РАБОТА ДАЕ ЛЕПШЫЯ ЯК ТОЛЬКІ КОЛЬКАСНЫЯ, АЛЕ І ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ КАЛЕКТЫЎНАЙ ПРАЦЫ. Трэба толькі гэту актыўнасьць мас скарыстаць, паказаць кожнаму калгасьніку яй лепш увесьці і праводзіць на практыцы зьдзельшчыну.

Зараз патрэбна згрупаваць увагу ўсёй грамадзкасьці, кожнага камуніста, вакол АСНОЎНАГА ЗЬВЯНА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ, — ВАКОЛ КАМПАНІІ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ДАХОДАЎ.

Нельга з посьпехам вынанаць дырэктывы партыі і ўраду аб разьмеркаваньні даходаў па колькасьці і якасьці працы пры ўмове, калі ў 3278 калгасах адсутнічае дакладны ўлік працадзён.

Трэба ўжыць усе захады да таго, каб у бліжэйшую дэкаду кожны калгас быў пераведзен на зьдзельшчыну, забясьпечан працоўнымі кніжкамі, каб быў наладжан ДАКЛАДНЫ ЎЛІК. Трэба для гэтай мэты скарыстаць увесь наяўны актыў раёнаў, вызначыць адпаведныя тэрміны, даць канкрэтныя заданьні.

ДЗЕНЬ ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ КОЖНЫ КАЛГАС ПАВІНЕН СУСТРЭЦЬ З ЎВЕДЗЕНАЙ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНАЙ, НАЛАДЖАНЫМ УЛІКАМ ПРАЦЫ, ПАДРЫХТАВАНЫМ ПРАЕКТАМ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ ДАХОДАЎ ЗА 1931 ГОД.

Аб зьдзельшчыне нават ня думаюць

БУДА-КАШАЛЕЎСКАЯ. Райкалгассаюз ня ўжывае ніякіх мер для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу «Пралетары» № 1. Аб увядзеньні зьдзельшчыны тут нават і ня думаюць. Улік працы не наладжан. Пры запісе працадзён ёсьць злоўжываньні. Старшыня калгасу піша сабе кожны дзень 2,60 працадня, палявод—2 працадні, кладаўшчык—2, загадчыкі аддзяленьняў па 2 працадні і г. д. Калгасьнікі гаворыць: «такіх двоек набярэцца да гібелі, а ты працуй на іх». Да разьмеркаваньня даходаў калгас не прыступіў, авансы не выдаюцца.

3-за адсутнасьці зьдзельшчыны і недаацэнкі палітычнага значэньня разьмеркаваньня даходаў дапушчаны прарывы ў выкананьні плянаў асеньняй с.-г. кампаніі: засталося нявыбранымі каля 40 гэкт. сенажаці, на полі ляжыць грэчка, да каланьня бульбы не прыступілі.

Раённыя арганізацыі павінны ўзмацніць кіраўніцтва калгасу «Пралетары» № 1, дапамагчы калгасу ўвесьці зьдзельшчыну і разьмеркаваць ураджай па колькасьці і якасьці працы.

Камсамолец.

У саўгасе імя Варашылава пануе абязьлічка

БЯЛЫНІЧЫ. У саўгасе імя Варашылава рабочая сіла скарыстоўваецца нерацыянальна, зьдзельшчына ня ўведзена, абязьлічка не ліквідавана. Дырэкцыя пакуль ніякіх мер ня ўжывае для правільнай арганізацыі працы.

Агранам-палявод дагэтуль ня ведае, хто павінен адказваць за поле. За якасьцю работы па сяўбе ніхто не наглядае. Вялікія кавалкі плошчы на заворваюцца, а жыта па іх сеецца. Зразумела, што пры такой рабоце ўраджай будзе вельмі дрэнны, як кажуць «што пасееш, то і пажнеш».

Дырэкцыі неабходна зараз-жа перабудаваць сваю работу, увесьці зьдзельную аплату, паставіць дакладны ўлік колькасьці і якасьці работы і па гэтай падставе ліквідаваць тыя прарывы, якія ёсьць у сяўбе і зьбіраньні.

Рабкор.

Перадавыя, бярэце на буксір адсталых

БАБРУЙСК. (Белта). На 1-га кастрычніка па калгасах Бабруйскага раёну абмалочана 99 проц. і разаслана 98 проц. выцераблена ільну. Па аднаасобным сэктары гэты від апрацоўкі ільну скончан.

У калгасах «Чырвоны працаўнік № 1» Харлаповіцкага сельсавету да гэтага часу стаіць на полі ў бабках 6 гэктараў выцераблена, але не абмалочанага ільну. Лён гніе, і калгас ня ўбірае яго з поля.

Калгасы «Новы Сьвет» № 1, Бярэсьцінскага сельсавету, «Чырвоны кастрычнік», Броскага сельсавету, імя Варашылава № 2 і «1-е мая» № 3, Хімаўскага сельсавету поўнасьцю падцялі трасту і прыступілі да апрацоўкі валакна.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы таму, што ўся работа праходзіла на аснове зьдзельшчыны, сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Райкалгассаюз ня прымаў мер для таго, каб вопыт перадавых калгасаў перанесьці ў адсталыя.

Калгас „Маяк"

адкладвае апрацоўку ільну на наступны год

ЛЕПЕЛЬ. Рад калгасаў Стайскага, Сьвяцкага, Каменскага, Лепельскага і іншых сельсаветаў яшчэ не разаслалі ўвесь выцераблены лён. У калгасе «Маяк» расьціл і апрацоўку ільну адкладваюць на наступны год. У многіх калгасах лён, які ўжо вылежаўся на сьцелішчах, падымаецца і пакідаецца для прасушкі на полі.

Калгас імя Калініна робіць так: падымае лён са сьцеліш і зараз звозіць у гумны. Сухі складвае ў павеці, а мокры развешвае на прасушку. Гэты прыклад неабходна перанесьці ва ўсе калгасы.

У некаторых калгасах Лепельшчыны падняты лён зусім не ахоўваецца, у выніку чаго часта расьцятваецца асобнымі калгасьнікамі. Неабходна зараз-жа ўстанавіць ахову ільну.

Калгасьнік.

Апрацоўка ільну ідзе пасьпяхова

Уборка ільну ў Крычаўскім раёне прайшла з посьпехам. Ужо 5 верасьня каля 10 калгасаў раёну здалі ільнасемя заготоўчым арганізацыям. Гэтыя посьпехі дасягнутыя ў выніку штодзённай барацьбы з кулаком і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі.

Кулак імкнуўся сарваць зьдзельшчыну ў калгасах, вёў агітацыю супроць узьняцьця прадукцыйнасьці працы калгасьнікаў, імкнучыся ўзарваць калгасы з нутры.

Але зараз на аснове шырокай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і адзіначасовнікаў, партарганізацыя Крычаўшчыны дала руйнуючы адпор кулацкай агітацыі.

Зараз цэнтр цяжару ўсёй работы сельпарткому і ячэек перанесен на фронт арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў. З 96 калгасаў раёну, 90 пераведзены на зьдзельшчыну. Праўда, у некаторых калгасах яна была праведзена фармальна, але гэты недахоп у большасьці выпадкаў ужо выпраўлен.

Асабліва добрыя вынікі ад правільна ўведзенай зьдзельшчыны ёсьць у сельсаветах суцэльнай калектывізацыі (Баеўскі, Бацьвінаўскі, Маляціцкі і інш.), дзе сельпарткомы і ячэйкі не на словах, а на справе перабудавалі сваю работу па-новаму. У гэтых сельсаветах ужо да 10 верасьня калгасы скончылі абмалот і расьціл ільну, а некаторыя з іх — поўнасьцю закончылі азімую сяўбу.

С.

Узмацніць загатоўкі насеньня кармавых траў, кораньплодаў і гародных культур

Тэлеграма ЦК КП(б)Б і СНК БССР

УСІМ САКРАТАРОМ РАЙКОМАЎ КП(б)Б і СТАРШЫНЯМ РАЙВЫКАНКОМАЎ.

Загатоўка насеньня кармавых траў, кораньплодаў і гародных культур раёнамі не разгорнута, што пагражае зрывам гадавога пляну загатовак.

Прапануем тэрмінова праверыць работу загатоўчых арганізацый і давядзеньне пляну загатовак да калгасаў, аднаасобнікаў, заможных гаспадарак.

Забясьпечыць арганізацыю ўборкі, абмалоту, здачы і выкананьне пляну загатовак у вызначаныя тэрміны.

Прыцягнеце да гэтай работы мабілізаваных.

Сакратар ЦК КП(б)Б **Шаранговіч.**

Нам. Старшыні СНК **Галадзед.**

Уборка бульбы

НІ АДНАГО КІЛЁ БУЛЬБЫ не пакінуць на полі

Усе сілы на неадкладнае выкананьне пляну ўборкі

Прычыны адставаньня

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). На 30 верасьня Рагачоўскі раён выканаў плян уборкі бульбы на 37,3 проц. Тэмпы ўборкі ў калгасах і саўгасах раёну нездавальняючыя. Саўгасы за ўвесь час убралі ўсяго 5 гэкт. бульбы, што складае 1,8 проц. пляну. Калгасы ўбралі 750 гэкт., або 23 проц.

У ДВОРАЦКІМ, МЯРКУЛАВІЦКІМ, ПАБАЛАЎСКІМ і іншых сельсаветах калгасы прыступілі да ўборкі бульбы толькі 27-28 верасьня.

Асноўнай прычынай адставаньня сельсаветаў зьяўляецца недапушчальна марудны пераход на зьдзельшчыну ў калгасах і саўгасах. З 127 калгасаў на зьдзельшчыну пераведзена толькі 109, прычым у радзе калгасаў зьдзельшчына ўведзена толькі фармальна.

У большасьці калгасаў рабочыя пляны па ўборцы бульбы не прапрацаваны на агульных сходах. Масавая работа вакол гэтай кампаніі вядзецца надзвычай слаба. Жаночая рабочая сіла не скарыстоўваецца.

Ёсьць выпадкі, калі пасобныя саўгасы і калгасы спадзяюцца выклікоча на дапамогу брыгад рабочых з раённага цэнтру. Так, у саўгасе «ТУРЭК» звыш

АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ УМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ—

рашаючая задача сельпарткомаў і ячэек

РАШУЧА ПЕРАСЯКАЦЬ У КОРАНІ ЎСЯКУЮ ПАГОНЮ ЗА ДУТЫМІ ПРОЦАНТАМІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

„Левакі" з Капыльскага раёну, ганяючыся за голай лічбай, тармозяць умацаваньне калгасаў.

Мацней удар па права-„лявацкай" агентуры кулака!

Пытаньні калгаснай вытворчасьці—у цэнтр увагі парт'ячэек!

Вузлавая задача

Посьпехі, дасягнутыя на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі ў галіне калектывізацыі, у выніку якіх калгасьнік стаў цэнтральнай фігурай зямляробства, стварылі новыя абставіны работы на вёсцы. У гэтых новых умовах **галоўнай задачай партыйных арганізацый зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.** У сваёй пастанове ад 2 жніўня ЦК УсеКП(б) у разьдзеле аб гарговых задачах партыйных арганізацый спажываючай паласы, а значыць і БССР, «асабліва папярэджвае арганізацыі гэтых раёнаў і абласьцей ад пагоні за раздутымі процантамі калектывізацыі».

Аднак, рад фактаў з месц сьведчыць аб тым, што некаторыя асобныя сельпарткомы і партыйныя ячэйкі гэту дырэктыву партыі ажыцьцяўляюць зельмі слаба. Аб гэтым выразна сьведчаць тыя матар'ялы, якія мы сёньня друкуем.

Правыя апартуністы **Прускага, Песачанскага** і інш. сельсаветаў Капыльшчыны ня выконваюць дырэктыў партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і гэтым самым умацоўваюць пазыцыі кулака, які намагае свае апошнія сілы на тое, каб падарваць калгасы з сярэдзіны. Адсутнасьць клясавай пільнасьці і недаацэнка з боку партарганізацый Песачанскага сельсавету рашаючага значэньня работы па разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў калгасах на аснове колькасьці і якасьці затрачанай працы у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў прывялі да таго, што ў некаторых калгасах гэтага сельсавету збожжа разьмяркоўваецца па кулацкіх прынцыпах. Так, у калгасе «Бальшавік» больш прадуктаў атрымлівае той калгасьнік, які да ўступленьня ў калгас меў буйнейшую гаспадарку. У выніку такога разьмеркаваньня значная частка беднаты і батрацтва ў гэтым калгасе не атрымалі амаль нічога.

Правая практыка ў радзе асобных месц цесна пераплятаецца з «лявацкімі» загібамі, носьбіты якіх у пагоні за раздутымі процантамі калектывізацыі яўна ігнаруюць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і гэтым самым аказваюць простую дапамогу правым апартуністам. Прыкладам «левых» перагібаў і захапленьня голымі процантамі калектывізацыі можа служыць **Слабада-Кучынская парт'ячэйка, Капыльскага раёну,** якая, паставіўшы перад сабой задачу закончыць калектывізацыю вёскі, дапусьціла значную засьмечанасьць клясава-варожым элемэнтам калгасу «Барацьбіт», дзе зараз сыстэматычна зрываецца выкананьне пляну адказьнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. **Сакратар Крывасёлкаўскай ячэйкі Гірко** даводзіць да кожнага члена партыі і беспартыйнага актывіста сельсавету заданьні аб тым, каб кожны з іх на працягу некалькіх дзён уцягнуў у калгас ня менш 6-ці аднаасобнікаў.

Партыйныя арганізацыі павінны **даць рашучы адпор апартуністам,** якія злачынна ўхіляюцца ад выкананьня дырэктыў партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і гэтым самым льлюць ваду на млын кулака.

Перабудаваць сваю работу па-новаму, перанесьці цэнтр яе цяжару ў нізавое зьвяно—аддзяленьне калгасу і саўгасу, аўладаць тэхнікай сельска-гаспадарчай вытворчасьці і на аснове гэтага канкрэтна і апэрацыйна кіраваць кожным саўгасам і калгасам—вось што забясьпечвае сельпарткомам і парт'ячэйкам на вёсцы ажыцьцяўленьне задач у галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Кожны камуніст павінен ведаць, што **барацьба за арганізацыйнае ўмацаваньне калгасаў—галоўная задача партыйных арганізацый на вёсцы, барацьба за зьдзельшчыну, ацэненую ў працэнтах, за правільнае разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю ў калгасах—ёсьць разам з гэтым барацьба за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва як клясы.**

Да суровага адказу за „лявацкія" перагібы

Калі ў часе веснавой сяўбы ў Капыльшчыне было калектывізавана 16 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, то зараз гэты процант узрос да 65,3 проц., прычым сацыялістычным сэктарам ахоплена звыш трох чвэртак пасеўнай плошчы раёну. Гэтыя посьпехі партарганізацыяй Капыльскага раёну дасягнуты ў выніку пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы і ўборкі і правядзеньня шырокай раструмачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што РАД СЕЛЬПАРТКОМАЎ І ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК У ПАГОНІ ЗА ДУТЫМ ПРОЦАНТАМ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ НЕДААЦАНІЛІ РАБОТЫ ПА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ, аддавалі зусім невыстарчальную ўвагу пытаньню арганізацыі працы ў калгасах. З боку паасобных членаў партыі мелі месца правая практыка і «лявацкія» загібы ў правядзеньні калектывізацыі.

Рад калгасаў раёну засьмечан кулацка-заможнымі элемэнтамі. Напрыклад, у калгасе імя Сьвярдлова заможнікі складаюць больш паловы калгасьнікаў, у калгасе «Пяцігодка» — 27 проц., у «КІМ'е» — 24 проц. У калгасах «Полымя» і «Ўльлянава» знайшлі сабе прытулак па некалькі кулакоў. Ёсьць выпадкі, калі ў склад праўленьняў праезьлі заможнікі (калгас імя Гея, «Барацьбіт» і інш.).

Па ПРУСКІМ сельсавеце ў трох калгасах зусім не аграмаджана маемасьць, а ў другіх калгасах гэтага-ж сельсавету да гэтага часу не аграмаджваецца прадукцыйная жывёла. Калі старшыня сельсавету заўважыў аб гэтым сакратару сельпарткому тав. Сакалоўскаму, апошні адказаў: «Гэта не твая справа. За гэту вёску адказваю я».

У выніку бязьдзейнасьці з боку паасобных сельпарткомаў і ячэек у радзе калгасаў кулакі разгарнулі шырокую агітацыю супроць правільнага разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю. У ПААСОБНЫХ КАЛГАСАХ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ДАХОДАЎ — ГЭТЫ ВАЖНЕЙШЫ ФАКТАР АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЗАМАЦАВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ — НЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЕЦЦА Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З ПАРТЫЙНЫМІ ДЫРЭКТЫВАМІ. У КАЛГАСЕ «БАЛЬШАВІК», ПЕСАЧАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, РАЗЬМЕРКАВАНА ЗБОЖЖА Ў ЗАЛЕЖНАСЬЦІ АД АГРАМАДЖАНАЙ ЗЯМЛІ КОЖНЫМ КАЛГАСЬНІКАМ, У ВЫНІКУ ЧАГО ТЫЯ КАЛГАСЬНІКІ, ЯКІЯ ДА ЎСТУПЛЕНЬНЯ Ў КАЛГАС МЕЛІ БОЛЬШ ЗЯМЛІ, АТРЫМАЛІ БОЛЬШ УРАДЖАЮ, А БЯДНЯЦКІЯ АТРЫМАЛІ ЗУСІМ МАЛА.

У радзе сельсаветаў (Крывасёлкаўскі, Бабаўнянскі, Ланцуцкі, Браткаўскі і інш.) замест разгортваньня масавай растлумачальнай работы паасобныя партыйныя ячэйкі і камуністы дапускаюць голае адміністраваньне ў адносінах да бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Прыкладам «лявацкага» заскоку зьяўляюцца мэтады правядзеньня калектывізацыі з боку САКРАТАРА КРЫВАСЁЛКАЎСКАЙ ЯЧЭЙКІ ТАВ. ГІРКО, які даў кожнаму члену партыі і беспартыйнаму актывісту заданьне — уцягнуць на працягу некалькіх дзён ня менш 6 гаспадарак у калгас.

Тав. Гірко разаслаў раду партыйцаў наступную пісьмовую, размножаную пад капірку, дырэктыву:

«Вам неабходна ўцягнуць у калгас да такога-та (даецца адзін дзень тэрміну) ня менш 6 гаспадарак. У выпадку, калі вы гэтага не праведзяцё, будзеце адказваць за нядбайныя адносіны па справаздачы.

З кам. прывітальнем **Гірко**».

За гэты недапушчальны факт «лявацкага» перагібу партыйная арганізацыя Капыльшчыны павінна прыцягнуць да суровай адказнасьці перагібшчыка Гірко. Мы ставім пытаньне, што зроблена кіраўніцтвам Крывасёлкаўскай ячэйкі ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў? Мы ставім пытаньне—як рэагаваў на гэтыя факты перагібаў райком партыі?

Партыйная арганізацыя Капыльскага раёну павінна ў цэнтр сваёй увагі паставіць арганізацыю працы, увядзеньне зьдзельшчыны, правільнае разьмеркаваньне ўраджаю ў калгасах і на гэтай аснове павінна дабівацца новых посьпехаў на фронце калектывізацыі. А. Ц.

У пагоні за голай лічбай

Парт'ячэйка СЛАБОДА-КУЧЫНСКАГА сельсавету (Капыльскі раён) ня так даўно рапартавала раёну аб тым, што вёска, у якой арганізаваўся калгас «Барацьбіт», калектывізавана на 100 проц. Аднак, кіраўніцтва ячэйкі чамусьці зусім не заўважвае таго, што ў гэтым калгасе злачынна ня выконваюцца пляны адказьнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Азімая сяўба зрываецца. Закончаная паўтара месяца таму назад сілосная яма да гэтага часу пустуе. Рад калгасьнікаў не аграмаджваюць ня толькі прадукцыйнай, але і рабочай жывёлы.

Усё гэта тлумачыцца тым, што СЛАБОДА-КУЧЫНСКАЯ ЯЧЭЙКА ПАГНАЛАСЯ ЗА ГОЛЫМІ КОЛЬКАСНЫМІ ПАКАЗАЛЬНІКАМІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ, ПАКІНУЎШЫ Ў БАКУ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ ЗАМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ. У гэтым калгасе кулацка-заможныя гаспадаркі складаюць звыш 50 проц. ад агульнай колькасьці калгасьнікаў.

Партыйная ячэйка яўна ігнаруе работу сярод беднаты, у выніку чаго частка апошняй знаходзіцца пад уплывам кулацка-заможных элемэнтаў.

Райком партыі павінен неадкладна заняцца работай слабода-кучынскай партыйнай ячэйкі і прыцягнуць да суровай адказнасьці апартуністаў, якія ігнаруюць справу арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасу.

П.

За паўгода ня зьбі раліся ні разу

У РАДЗЕ ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК АСІПОВІЦКАГА РАЁНУ РАБОТА СЯРОД ЖАНЧЫН БЫЛА ПАСТАЎЛЕНА НАДЗВЫЧАЙ ДРЭННА. У ЛАПІЦКАЙ ЯЧЭЙЦЫ КІРАЎНІКОМ ДЭЛЕГАЦКАГА СХОДУ БЫЎ ВЫЗНАЧАН ТАВ. ЗАЙЦАЎ, ЯКІ НА ПРАЦЯГУ ГОДУ НАВАТ НЕ НАВЕДВАЎ ДЭЛЕГАЦКІХ СХОДАЎ. НА ПРАЦЯГУ 6 МЕСЯЦАЎ У М. АСІПОВІЧАХ ДЭЛЕГАЦКІЯ СХОДЫ НЯ СКЛІКАЛІСЯ.

СТВОРЫМ ВЯЛІКАЕ МАСТАЦТВА БАЛЬШАВІЗМУ

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б расьце і разьвіваецца нацыянальная пралетарская культура і яе неадлучная частка—тэатральнае мастацтва

Пастаноўкай „Гуты" БДТ-1 зрабіў буйны крок па шляху падпарадкаваньня сваёй работы задачам рэканструкцыйнага пэрыяду

БелАПП вітае юбіляра

Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў горача вітае калектыў першага беларускага дзяржаўнага тэатру з сотым паказам п'есы «Гута», якая напісана членам нашай асацыяцыі, рабочым пісьменьнікам Р. Кобецам.

Уступіўшы паказам «Гуты» на шлях стварэньня вялікага мастацтва бальшавізму, БДТ—І перамог тыя шкодныя нацыянал-дэмакратычныя канцэпцыі, якія доўгі час панаўлялі тэатр, стрымліваючы яго разьвіцьцё.

БелАПП абяцае ўсямернае падтрыманьне калектыву БДТ—І у яго рабоце па стварэньні беларускай пралетарскай драмы.

Прывітаньне юбіляру!

САКРАТАРЫЯТ БелАПП'у.

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

З вялікім задаваленьнем Галоўмастацтва БССР адзначае соты паказ пастаноўкі на беларускай сцэне «Гуты» Р. Кобеца—перамогі калектыву БДТ-І.

Група беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў разам з нацыянал-апартуністамі імкнулася не дапусьціць «Гуту» на сцэну. Аднак, пад націскам пралетарскай грамадзкасьці п'еса была ўзята ў распрацоўку.

Пастаноўка «Гуты» зьяўляецца першым проблескам стварэньня беларускага пралетарскага тэамастацтва. Перамога калектыву тэатру—**гэта перамога ўсёй беларускай пралетарскай грамадзкасьці, усяго беларускага пралетарскага тэатфронту.**

Галоўмастацтва ўпэўнена, што калектыў БДТ-І, атрымаўшы бліскучую перамогу, пойдзе наперад і ў сваёй штодзённай рабоце пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі яшчэ больш аддана будзе працаваць над стварэньнем вялікага мастацтва бальшавізму.

Для таго, каб дабіцца далейшых перамог, калектыў тэатру павінен быць да канца адданым справе рабочай клясы, павінен аўладаць тэорыяй Маркса і Леніна, арганічна зьвязацца з рабочай клясай, змагацца за дыялектычна-матэрыялістычную мэтадалёгію ў рабоце тэатру і за тэатральную тэхніку культуры.

Гарачае прывітаньне калектыву актораў, аўтару, рэжысуры, і ўсім удзельнікам пастаноўкі першага арыгінальнага беларускага пралетарскага паказу.

Няхай жыве КП(б)Б—кіраўнік і арганізатар будаўніцтва сацыялізму!

Галоўмастацтва—**Гурскі, Любан, Шамшур.**

Рыгор Кобец — аўтар «Гуты»

„А бяз тэхнікі—як-жа сацыялізм....."

У соты раз граючы ролю вынаходцы Мароза, не ўдаючыся ў падрабязны аналіз, у кароткіх рысах я хачу сказаць аб ідэйнай устаноўцы аўтара, рэжысэра і маёй, як выканаўцы гэтай ролі ў п'есе «Гута».

Заслужаны артыст Рэспублікі ЎЛ. КРЫЛОВІЧ

Калі паўтары гады таму назад я атрымаў у працу гэту ролю, я адразу ўгледзеў у ёй матар'ял ня толькі «іграваго» парадку, але і вялікую сацыяльна-клясавую сутнасьць. Захапіла тая праўда, з якой аўтар — тав. **Кобец** гаворыць гэтым вобразам вуснамі гэтага старога пралетара. І перада мною паўстала задача ў мастацкай форме, вобразам і дзеяньнем Мароза сказаць аб праблемах падрыхтоўкі кадраў, мэханізацыі вытворчасьці, вынаходзтва, сказаць аб барацьбе за ідэю, да якое заклікае партыя і рабочая кляса.

Перада мной паўстала задача на тэме п'есы паказаць труднасьці, перашкоды з якімі сустракаецца рабочы-вынаходца без належнага аўладаньня тэхнікай, для зацьвярджэньня ў агульнай ідэі спэктаклю правільнасьці ўстаноўкі камуністычнай партыі ў пытаньнях вырашэньня гэтых праблем.

У процілегласьць скрытнасьці, палахлівасьці, хістаньням Мароза побач з імрасьце і выхоўваецца Цыганок — камсамолец, адкрыты, з новай псыхікай, рашучы, сьмелы — надзейная зьмена.

Асноўнасьць мэтаімкненьня ў Мароза я ўгрунтаваў словамі: «а бяз тэхнікі — як-жа сацыялізм?». У гэтым клясавая сутнасьць мільёнаў Марозаў, гэта ёсьць пытаньне, над вырашэньнем якога зараз змагаецца партыя і рабочая кляса.

У сьветапоглядзе і імкненьнях Мароза няма бальшавіцкай рашучасьці і сьмеласьці і яго ў гэтым некалькі дапаўняе Цыганок, а таму цалкам выбраз Мароза я не разглядаю поўнакроўным і поўнацэнным у сваёй пралетарскай сутнасьці. Вобраз Мароза я разглядаю, як сацыяльнае зьявішча, якое толькі будучы дапоўненым бальшавіцкай рашучасьцю можа быць зацьверджана, як узор.

На сёньняшні дзень павінен адмерці мяккі сымпатычны дзядуля, які ня адольны да адкрытай складанай і моцнай барацьбы.

Перада мной стаяла і яшчэ задача ня зьпісіць вобраз да паказу схэмы і голага фармалізму і, паколькі ўся п'еса трактуецца ў пляне ўмоўнага рэалізму, я ўзяў Мароза ў рэалістычных тонах. абмінаючы па магчымасьці бытавыя дробязі.

Заслужаны артыст рэспублікі **Ул. КРЫЛОВІЧ.**

Артыст Крыловіч у ролі Мароза

„Гута" ў тэатральнай крытыцы

У чэрвені месяцы мінулага году БДТ—І прымаў удзел на ўсесаюзнай алімпіядзе мастацтва. Тэатр выступаў з паказам **«Міжбур'я»** і **«Гуты»**. Шырокая пралетарская грамадзкасьць, што бачыла ў Маскве «Гуту», дала бліскучую ацэнку акторскаму калектыву. Пастаноўкі БДТ—І, і асабліва пастаноўка «Гуты», праходзілі з надзвычайным посьпехам. І гэта зразумела, бо п'еса выражае рад жыцьцёвых праблем, паказвае, як на былой прытчэчанай царскай акраіне ў цяперашній БССР змагаецца рабочая кляса за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. У зразумелых мастацкіх вобразах «Гуты» перад глядачом раскрываецца, малюнак за малюнкам, абвостраная клясавая барацьба, барацьба паміж старым і новым, паміж сапраўднымі ўдарнікамі бальшавіцкіх тэмпаў і агентамі і непасрэдным прадстаўнікамі кулацтва.

Пастаноўка «Гуты» ў БДТ—І у радзе расійскіх, украінскіх, грузінскіх і інш. тэатраў з усёй выразнасьцю гаворыць аб тым, што аўтар яе тав. **Кобец**, зьяўляючыся рабочым, добра ведаючы вытворчыя працэсы і працэсы клясавай барацьбы, змог даць тэатру высока мастацкую і клясава-завостраную п'есу. Змог п'есу зрабіць зразумелай для самых шырокіх колаў працоўных, п'есу, якая сваёй зразумелай і сакавітай мовай, сапраўдным рэалізмам захапляе глядача, прымушае яго разам з лепшымі прадстаўнікамі рабочага калектыву Марозамі, Цыганкамі хваляванца, радавацца і сумаваць.

Вялікарнай заслугай калектыву БДТ—І зьяўляецца тое, што ён вельмі ўважліва падышоў да робачага аўтара, аказаў яму патрэбную дапамогу ў творчай рабоце.

Украінскі тэатральны крытык т. **С. Гец**, які напісаў спэцыяльную кніжку аб беларускім тэатры, асабліва падкрэсьлівае заслугі БДТ—І у рабоце з аўтарам.

«Гута»,—піша тав. Гец,—**па сутнасьці першы спэктакль, дзе тэма пра рабочае вынаходзтва знаходзіць патрэбнае сцэнічнае асьвятленьне...**

... Характэрным зьяўляецца тое, што гэта арыгінальная і цікавая п'еса належыць пяру аўтара-рабочага. П'есу пра гуту напісаў рабочы заводу Рыгор Кобец. І тое, што тэатр зьвярнуў сваю ўвагу на рабочага-аўтара, тое, што тэатр уважліва аднёсься да яго першай нясьмелай спробы і любоўна дапамог яму ўкласьці свае рабочыя думкі і цьверджаньні ў патрэбныя мастацкія формы, і тое, нарэшце, што тэатр з вялікім захапленьнем паказаў на сцэне твор рабочага-аўтара, гаворыць аб тым, што Белдзяржтэатр сапраўды шчыльна падышоў да свайго работніка глядача».

Адзначаючы разультаты алімпіяды мастацтва, тав. **Глебаў** у артыкуле, які зьмешчан у часопісі «Литература и искусство», падкрэсьлівае, што:

«У радзе нерасійскіх тэатраў 1-шы дзяржаўны тэатр БССР вызяўляў найбольшую ўвагу да палітычнай актуальнасьці сваёй работы і найбольшае ўменьне працаваць з аўтарам. Работа беларускага тэатру над п'есай маладога рабочага драматурга Г. Кобеца аспругоўвае ўсякага ўхваленьня і увагі з боку ўсіх іншых тэатраў».

Аб тым, што БДТ—І сваёй пастаноўкай «Гуты» значна наблізіўся да непасрэднага адлюстраваньня ў мастацкай форме задач сацыялістычнага будаўніцтва, што ён шчыльна падышоў да абслугоўваньня рабочага-глядача, канстатавала журы 1-ай усесаюзнай алімпіяды мастацтва народаў СССР.

«Журы са здаваленьнем канстатуе,—гаворыцца ў водгуку,—што тэатр правёў пасьпяховую барацьбу па перамаганьні нацыянал-дэмакратычнай тэндэнцыі. **Ён падышоў да праблемы нацыянальнага мастацтва на шляхам падкрэсьлівання экзатычных дэталей старасьветчыны, а шляхам вывучэньня рабочай клясы Беларусі сёньняшняга дня.** Гэта, а таксама вострая актуальная тэматыка (рацыяналізацыя, пяцідзёўка, быт Чырвонай армії), вырашаныя этодна нацыянальным умовам, парадняюць тэатр з усёй рабочай клясай».

Некалькі часу ў гэтым годзе БДТ—І працаваў у буйнейшых пралетарскіх цэнтрах братэрскай украінскай рэспублікі. Шырокія масы рабочых УССР змаглі азнаёміцца з культурнымі дасягненьнямі БССР, змаглі ўбачыць, як пралетарыят БССР змагаецца за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, будуе культуру нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьмесьце.

Украінская камуністычная крытыка, ацэньваючы работу БДТ—І і асабліва пастаноўку «Гуты», падкрэсьлівала, што тэатр дасягнуў важнейшых посьпехаў у справе паказу рабочаму—глядачу ў мастацкіх вобразах гераічнай змаганьня за сацыялізм.

Ул. Зпл.

НА ПАРОЗЕ ТЭАТРАЛЬНАГА СЭЗОНУ

За 14 год творчай напружанай работы пралетарыят СССР пад ленінскім кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі прайшоў вялізарнай гістарычнай значнасьці шлях.

На аснове бурна ўзрастаючай сацыялістычнай індустрыі канчаткова вырашана пытаньне «хто каго» ў прамысловасьці, завяваны рашаючыя перамогі ў сацыялістычнай рэканструкцыі с.-г. Пралетарская краіна ўступіла ў пэрыяд сацыялізму.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва карэнным чынам зьмяняюць твар краіны, узбагачаюць яе матар'яльныя і культурныя каштоўнасьці. Сацыяльна-эканамічныя зрухі зьмяняюць быт працоўных мас, папяраючы іх культурныя запатрабаваньні.

«Рабочы зараз — ня тое, што раней. Цяперашні рабочы, кажа савецкі рабочы, хоча жыць з задаваленьнем усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэбнасьцяй і ў сэнсе забесьпячэньня харчамі, і ў сэнсе кватэр, і ў сэнсе забесьпячэньня культурных і ўсякіх іншых патрэбнасьцяй. Ён мае на гэта права і мы абавязаны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы... Ён патрабуе забесьпячэньня ўсіх сваіх бытавых і культурных патрэбнасьцяй і мы абавязаны выканаць гэта яго патрабаваньне» (Сталін).

Рост матар'яльных багацьцяў Савецкага Саюзу і на гэтай аснове шпаркі культурны рост пралетарыяту зусім **ПА-НОВАМУ СТАВЯЦЬ ЗАДАЧЫ ПЕРАД МАСТАЦТВАМ.** Пралетарскае мастацтва, як дзейная палітычна-актыўная зброя арганізацыі і выхаваньня волі мас на вырашэньне задач пяцігодкі, —павінна адыгрываць адказную ролю ў агульным сацыялістычным будаўніцтве.

У справе стварэньня пралетарскага тэатральнага мастацтва, у справе задаваленьня культурных патрэб савецкага рабочага пралетарыятам **ЗАВАЯВАНЫ ВЯЛІКІЯ ПЕРАМОГІ.** Лепшым доказам гэтага зьяўляецца бурны рост пралетарскага, нацыянальнага тэатральнага мастацтва ў БССР.

Калі да Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі БССР ня было ні аднаго тэатру, дык на сёньняшні дзень, у выніку правільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, мы налічваем іх дзесяткамі. Першы беларускі дзяржаўны тэатр, другі беларускі дзяржаўны тэатр, яўрэйскі дзяржтэатр ужо вырасьлі ў магутныя мастацкія арганізмы і сталі актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва. Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр за апошні год упартай работы дабіўся пералому ў бок актуалізацыі свайго рэпэртуару і набліжэньня да пралетарскага сьветапогляду. Гэта дало магчымасьць паставіць пытаньне (і цяпер ужо вядзецца падрыхтоўчая работа) аб рэарганізацыі з вясны 1932 году БДВТ у трэці беларускі дзяржаўны тэатр. Апрача гэтага ў Беларусі працуюць ужо звыш двух год і прарабілі вялікую работу наступныя тэатры: некалькі ТРАМ'аў, яўрэйскі ДВТ, польскі тэатр, рабочы тэатр ЦСПСБ, ансамбль беларускіх народных інструмантаў і інш.

Вядзецца падрыхтоўчая работа да стварэньня ў пачатку 1932 году новых тэатраў: беларускі калгасны экспэрымэнтальна-паказальны тэатр, два калгасныя тэатры раённага прызначэньня, дзяржаўны дзіцячы тэатр, беларуская эстрадная група.

Практыка мінулых год кажа аб неабходнасьці пераводу асноўных тэатральна-мастацкіх адзінак на стацыянарны тып работы. Выходзячы з гэтага Наркамасьветы выдаў пастанову аб вызначэньні для яўрэйскага дзяржаўнага тэатру пастаяннай базы ў Менску (Дом культуры), дзе ён і пачне працу са студзеня 1932 году. Таксама ўжо пастаўлена пытаньне аб стварэньні беларускіх стацыянарных тэатраў у Менску, Віцебску і Гомелі.

Разгортваньне работы існуючых тэатраў, стварэньне новых, ставяць па-баявому задачу ўдарнага будаўніцтва новых тэатральных будынкаў. Гэта пытаньне атрымала станоўчае вырашэньне, і ўжо будуюцца новыя гарадзкія тэатры ў Бабруйску і Воршы. Вясною 1932 году будзе прыступлена да пабудовы новага тэатру на 2.500 месц у Менску. Таксама вядзецца падрыхтоўка да будаўніцтва тэатру ў Гомелі на 2.000 месц.

Адначасова з пабудовай спэцыяльных новых тэатральных будынкаў з мэханізацыяй сцэны і з іншымі ўдасканаленьнямі трэба абавязкова дабіцца таго, каб пры будаўніцтве раённых дамоў сацыялістычнай культуры былі прадугледжаны сцэнічныя пляцоўкі і тэатральныя залі.

Гэта значна пашырыць матар'яльную базу для работы беларускіх тэатраў, асабліва для вандроўных і дасьць магчымасьць уэьніць мастацкую якасьць і ідэйную каштоўнасьць іх работы на вышэйшую ступень.

***

Апошнія тры гады на фронце стварэньня беларускага пралетарскага тэамастацтва прайшлі пад лёзунгам **БЯЗЬЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБЫ НА ДВА ФРОНТЫ.** Маладой пралетарскай драматургіі разам з вядучым атрадам беларускай савецкай літаратуры — БелАППА'м, пры самай актыўнай дапамозе ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, прышлося вытрымаць вялікія бойкі з контррэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам. У гэтай барацьбе вораг быў поўнасьцю выкрыты. Яму нанесены руйнуючы удар. Беларускія контр-рэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты адзін час акапаліся ў беларускім тэатры і з савецкай сцэны прапаведвалі сваю атрутную ідэалёгію. Гэта выразна выявілася ў такіх пастаноўках БДТ-1, як «Кастусь Каліноўскі» Міровіча, «Каля тарасы» Грамыкі, «Вір», «Тутэйшыя» і г. д.; у БДТ-2 — «Скарына, сын з Полацку», «Апрамечная» і ў іншых нацдэмаўскіх пастаноўках.

Беларуская пралетарская літаратура і маладая пралетарская драматургія пад кіраўніцтвам КП(б)Б горача ўзяліся за выкарчоўваньне нацдэмаўскай спадчыны ў тэатральным мастацтве і сьледам за перакладнымі пралетарскімі п'есамі далі для БДТ-1 **«ГУТУ»** Р. Кобеца, для БДТ-2 — **«КАЧАГАРЫ»** Іл. Гурскага.

Барацьба з контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчынай у тэатральным мастацтве была разам з тым і барацьбою за стварэньне новых пралетарскіх кадраў для беларускага тэатру, барацьбою за перавыхаваньне і набліжэньне да пралетарыяту старых акторскіх і рэжысэрскіх кадраў, якія значны час знаходзіліся пад уплывам нацыянал-дэмакратаў. Праблема нацыянальных кадраў для тэатру і зараз стаіць вельмі **ВОСТРА.** Ад таго, наколькі мы справімся з задачамі падрыхтоўкі кадраў, у значнай меры залежыць далейшае разьвіцьцё пралетарскага мастацтва на Беларусі.

Апошні тэатральны сэзон быў сэзонам замацаваньня пералому ў рабоце тэатраў, замацаваньня першых дасягненьняў у справе паляпшэньня мастацка-ідэалёгічнай якасьці рэпэртуару, сэзонам праверкі таго, наколькі наш рэпэртуар адпавядае задачам рэканструкцыйнага пэрыяду.

Сучасны этап разьвіцьця беларускага пралетарскага тэатру характарызуецца радам **ЗРУХАЎ** у бок замацаваньня пералому і далейшых зазваяваньняў ідэалёгічна-мастацкіх вышынь.

Гэтыя зрухі забясьпечаны агульным пераможным ходам сацыялістычнага будаўніцтва і выяўляюцца ў больш цеснай сувязі тэатраў з фабрыкай і заводам, у першых кроках мабілізацыі пралетарскіх і савецкіх пісьменьнікаў на ліквідацыю адставаньня тэатру ад тэмпаў рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, што значна ўзмацняе пралетарскі сэктар беларускай драматургіі (больш 20 новых аўтараў зараз працуюць над п'есамі для беларускіх тэатраў), у абнаўленьні тэатральных калектываў маладымі пралетарскімі акторска-рэжысэрскімі сіламі, у рашучай ачыстцы рэпэртуару ад усяго ідэалёгічна-варожага.

Да сэзону 1931-32 году беларускія дзяржаўныя тэатры прышлі ўжо **ЗНАЧНА ВЫРАСШЫМІ** ў ідэалёгічна-мастацкім сэнсе, а таксама з некаторым вопытам змаганьня за сацыялістычную рэканструкцыю тэатральнага мастацтва і аўладаньня дыялектычна-матэрыялістычнай мэтадалёгіяй.

***

Ня гледзячы на відавочнае прасоўваньне беларускага тэатру наперад па шляху ўключэньня яго ў непасрэднае выкананьне задач пяцігодкі, нас гэтыя першыя зрухі і дасягненьні ні ў якай ступені задаволіць ня могуць.

Нашы тэатры яшчэ значна адстаюць ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і задач рэканструкцыйнага пэрыяду. Мы яшчэ ня можам сказаць, што нашы тэатры зьяўляюцца сапраўднымі мастацкімі агітпропамі за генэральную лінію партыі, што яны цалкам здаваляюць культурныя патрэбнасьці рабочага глядача. Да гэтага тэатры павінны ўсямерна імкнуцца і як найхутчэй ірыйсьці. Але на сёньняшні дзень яны яшчэ значна недавыкоўваюць свайго палітычнага і мастацка-ідэалёгічнага «прамфінпляну».

Распачаты тэатральны сэзон павінен праходзіць пад кутом далейшай **РАЗГОРНУТАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ДЫЯЛЕКТЫЧНА - МАТЭРЫЯЛІСТЫЧНЫМ МЭТАДАМ.**

І мала толькі прысягаць у вернасьці дыялектычнаму мэтаду, трэба глыбока вывучаць марксыцка-ленінскую тэорыю. Трэба навучыцца правільна разумець рэчаіснасьць і правільна карыстацца дыялектычным мэтадам.

За гэту цяжкую работу павінны неадкладна ўзяцца ўсе тэатральныя калектывы, бо, не аўладаўшы марксыцка-ленінскім сьветапоглядам, нельга будзе перамагчы адставаньне і перабудаваць работу.

Далейшая барацьба за рашучае набліжэньне тэатру да задач рэканструкцыйнага пэрыяду, за актуальны ідэалёгічна і мастацка-вытрыманы рэпэртуар павінна ісьці як на лініі стварэньня арыгінальных беларускіх пралетарскіх рэчаў, так і на лініі перакладу лепшых узораў пралетарскай драматургіі іншых нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу.

Група беларускіх пралетарскіх і савецкіх пісьменьнікаў узялася за напісаньне п'ес для нашых тэатраў. Гэтае пачынаньне трэба ўсямерна падтрымаць, аказаць пачынаючым драматургам патрэбную дапамогу як у форме рэжысэрскай і марксыцка-мэтадалёгічнай кансультацыі, так і за конт матар'яльных і іншых умоў.

Тав. Сталін у сваёй гістарычнай прамове «Новая абстаноўка — новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва» даў разгорнутую праграму барацьбы за сацыялізм. Тэатры павінны **ПЕРАКЛАСЬЦІ** сталінскія ўказаньні аб аўладаньні тэхнікай, аб новых задачах гаспадарчага будаўніцтва ў высока-мастацкія вобразы, **СТВАРЫЦЬ** каштоўнейшыя, актыўнадзейныя пралет

Няўхільнай рэалізацыяй указаньняў тав. Сталіна забясьпечым поўнае выкананьне пляну трэцяга рашаючага

Жнівень месяц даў значнае палепшаньне работы прамысловасьці БССР у галіне выпуску прадукцыі. **За жнівень валавая прадукцыя ў параўнаньні з ліпенем б. г. павялічылася на 22,3 проц.** Адхіляючы цалы рад выпадковых фактараў, якія ўзьдзейнічалі на гэты прырост, як-та: пуск шкляных заводаў пасьля рамонту, працяг сэзону па тарфяной прамысловасьці, усё-ж будзем мець значны рост прадукцыі па радзе галін прамысловасьці — саўгана-абутковай, мэталапрацоўчай, швейнай і г. д.

Гэтыя посьпехі зьяўляюцца **першымі вынікамі перабудовы работы гаспадарчых арганізацый на шляху барацьбы з абязьлічкай, ураўніваўкай, скажэньнямі крэдытнай рэформы, цэнтралізацыяй** і г. д. Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы першым яшчэ далёка невыстарчальным крокам па разгортваньні і ўкараненьні гаспадарчага разрахунку і барацьбы за правільную арганізацыю працы **ў напрамку рэпізцыі ўказаньняў тав. Сталіна.**

Чацьверты квартал трэцяга году пяцігодкі зьяўляецца баявым кварталам, на працягу якога дасягнутыя посьпехі павінны быць замацаваны і значна пашыраны, каб шляхам ліквідацыі прарываў узяць вышыні чацьвертага апошняга году пяцігодкі.

Гэтыя вышыні вызначаны ў пляне работ чацьвертага заключнага году пяцігодкі. Вось асноўныя вехі разьвіцьця прамысловасьці БССР **у 1932 г.** Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць на 1932 г. мяркуюцца ў 189 млн. руб. і ў электрабудаўніцтва — у 33 млн. руб. Рост агуловай прадукцыі прамысловасьці БССР у параўнаньні з 1931 г. складзе 51,4 проц., а па рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГ — 60,4 проц. Рост прадукцыйнасьці працы — 25 проц., зьніжэньне сабекошту — 10 проц. і г. д.

Па вядучых галінах прамысловасьці кантрольныя лічбы на 1932 г. у першую чаргу прадугледжваюць далейшае пашырэньне торфаздабычы, каб забясьпечыць у асноўным перавод усёй прамысловасьці на мясцовы апал. Таксама прадугледжваецца рэканструкцыя асноўнага капіталу мэталяпрамысловасьці ў бок ня толькі агульнага росту прадукцыі, але і спецыялізацыі заводаў для задавальненьня патрэб асноўных галін народнай гаспадаркі, у першую чаргу аграмаджанага сельскага сэктару.

Асаблівае значэньне набывае разьвіцьцё прамысловасьці новых відаў будматар'ялаў. Далейшае пашырэньне гэтай прамысловасьці мяркуецца шляхам разгортваньня вытворчасьці новых відаў дахавых і будаўнічых матар'ялаў, мэханізацыі цагельнай вытворчасьці і пераводу яе на выпрацоўку эфэктнай цэглы, што павінна скласьці ня менш 60 проц. ўсёй прадукцыі сьценавых матар'ялаў. Адначасова кантрольныя лічбы прадугледжваюць належнае разгортваньне лёгкай індустрыі, якое адпавядае шпарка растучым матар'яльна-культурным запатрабаваньням рабочых і калгасьнікаў.

Кантрольныя лічбы 1932 г. поўнасьцю забясьпечваюць выкананьне асноўных задач — завяршыць пяцігодку за чатыры гады і максымальна ўзмацніць вядучую ролю прамысловасьці ў сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі БССР.

Узятыя тэмпы ў кантрольных лічбах 1932 г. зьяўляюцца абсалютна рэальнымі. Вопыт мінулых гадоў і лепшых прадпрыемстваў з поўнай яснасьцю даказаў, што ўсе ўмовы для пасьпяховага выкананьня заданьняў народна-гаспадарчага пляну ёсьць у наяўнасьці. Усякія размовы аб нерэальнасьці плянаў — характэрная правая апартунізму. Толькі апартуністы розных колераў і **«каляпарытыўныя абываталі»**, аб якіх гаварыў тав. **Сталін**, замест барацьбы з безгаспадарчасьцю, барацьбы за сапраўдны гаспадарчы разрахунак, замест мабілізацыі сіл у барацьбе за якасныя і колькасныя паказчыкі, могуць прапанаваць раўняцца на вузкія месцы і спасылацца на аб'ектыўныя прычыны ў невыкананьні плянавых заданьняў.

Галоўным вагаром аўладаньня вышынямі чацьвертага году пяцігодкі зьяўляецца — уменьне ў новай абстаноўцы, у новых умовах, па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць. Але, на вялікі жаль, гэтая важнейшая дырэктыва партыі, даная ў прамове тав. **Сталіна**, ня ўсюды і не заўсёды праводзіцца ў жыцьцё з бальшавіцкай рашучасьцю.

Да гэтага часу ёсьць такія гаспадарнікі, якія займаюцца агульнымі дэкларацыямі і запаўніваньнямі аб перабудове працы, замест практычнай рэалізацыі ўказаньняў тав. **Сталіна** па тых вучастках, дзе яны працуюць.

Задачы, якія стаяць перад прамысловасьцю, патрабуюць ад нас назаўсёды пакончыць з дэкларацыямі і, закасаўшы рукавы, узяцца за сапраўднае ажыцьцяўленьне гаспадарчага разрахунку, вядучы бязьлітасную барацьбу супроць абязьлічкі, ураўніваўкі, за правільную арганізацыю працы, за мэханізацыю працаёмкіх работ, за арганізацыю прыліву рабочых кадраў з калгасаў, за палепшаньне матар'яльных і культурна-бытавых умоў рабочых і спецыялістаў.

Трэба добра памятаць усім гаспадарнікам, што работа ў чацьвертым кварталe б. г. павінна праходзіць так, каб забясьпечыць у гэтым кварталe нарастальнае такіх тэмпаў, якія-б адпавядалі тэмпам і наметкам 1932 г. Чацьверты квартал зьяўляецца апошняй ступенькаю да заключнага году пяцігодкі. Вось чаму зьяўляецца зусім абавязковым ня толькі замацаваньне жніўеньскіх дасягненьняў, але **значнае пашырэньне і паглыбленьне іх па ўсіх галінах народнай гаспадаркі.**

Мы ўступілі ў апошні этап нэп'у. Мы завяршаем пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Новы этап, новы гігацкі ўздым мае свае труднасьці. Праз мабілізацыю мас вакол дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)В, за генэральную лінію партыі, у бязьлітасную барацьбе з апартунізмам розных колераў, гэтыя труднасьці будуць пераможаны. Адказныя задачы чацьвертага кварталу — апошняга году пяцігодкі будуць поўнасьцю выкананы. **АМБРАЖУНАС.**

На рыштаваньнях ударных пабудоў

НЕ МАРУДЗІЦЬ З ПЕРАБУДОВАЙ СЫСТЭМЫ АПЛАТЫ ПРАЦЫ

НА ПАБУДОВЕ ДОМУ УРАДУ ПРАГРЭСЫЎКАЙ АХОПЛЕНА 10-15 ПРОЦ. РАБОЧЫХ. У МЕНСКУ І БАБРУЙСКУ ПРАГРЭСЫЎКУ СКАЖАЮЦЬ

Выкарыстаць вопыт ударных пабудоў, якія новай формай аплаты дабіліся ўзьнікьцьця прадукцыйнасьці працы і павышэньня заработку рабочых

У перабудове форм аплаты працы на аснове ўказаньняў тав. **Сталіна**, будоўлі Беларусі адстаюць. Новая сыстэма аплаты працы ахапіла зусім невыстарчальны кантынгэнт пабудоў і рабочых. Ураўніваўка не ліквідавана нават на такім буйным аб'екце, як **Крычаўскі** цэмэнтны завод.

На пабудове Дому ўраду ў **Менску**, дзе занята 1.000 рабочых, прагрэсыўна—прэміяльнай аплатай ахоплена усяго 10-15 проц., на Менбуду з 800 рабочых толькі 12 брыгад з ахопам 72 чалавек і то з 1-га верасьня. Рад аддзяленьняў **Белбудканторы**, не гледзячы на шматлікія дырэктывы, дагэтуль прагрэсыўкі не ўвялі. Кіраўнік **магілеўскага** аддзяленьня **Белбудканторы** 22 верасьня заявіў прадстаўніку ЦП саюзу будаўнікоў, што ён аб прагрэсыўцы чуе ўпяршыню. Між тым сумесная дырэктыва ЦП саюзу і Белбудканторы спакойна ляжала ў стале тарыфна-нармовачнага бюро **Магілёўскай** канторы.

Адзначаны шматлікія факты скажэньняў прагрэсыўкі.

У **Віцебску** на работах аддзяленьняў Белбудканторы прагрэсыўку ўвялі заднім числом—з ліпеня. Рэкорд няўважлівасьці і недапушчальна-нядбайных адносін да гэтага пытаньня праявіла **Мінскае** аддзяленьне Белбудканторы, якое ня вывучыўшы ўмоў работы і іншых прадпасылак, мэханічна павялічыла заработную плату рабочым на розныя проценты аж да 75 проц. і нават на рамонтных ненармаваных работах.

У Менбудзе пры няўважным ахопе прагрэсыўнай аплатай, апошняя змазваецца тым, што разрахунак робіцца з брыгадай у цэлым, а апошняя дзеліць заработак паміж сваімі членамі поравну, па прынцыпе ўраўніваўкі.

Нерашучасьць, скажэньні, якія дапушчаюцца некаторымі гаспадарчымі арганізацыямі тармозіць скарачэньне падзённічыны, якая паводле даных Белбудаб'яднаньня на раду пабудоў дасягае 30 проц.

Затое, там, дзе трыкутнікі па-бальшавіцку ўзяліся за перабудову сыстэмы зарплаты, дасягнуты вельмі добрыя вынікі. На пабудове **дому № 1 у Менску** прагрэсыўкай ахоплены ўсе брыгады каменшчыкаў, песьляроў і чорнарабочых. У выніку ажыцьцяўленьня новай сыстэмы аплаты, брыгады каменшчыкаў перавыканалі свае нормы на 49-68 проц., песьляроў-на 23 проц. Падзённічына сярод кваліфікаваных рабочых зусім ліквідавана, а сярод чорнарабочых зьніжана да 4 проц. Прагулы зьменшыліся да 0,62 проц. У сьвязку з увядзеньнем новай шэсьціразрыднай сеткі, значна ўзрасла зацікаўленасьць сярод рабочых, асабліва маладых. Такія-ж вынікі дасягнуты на пабудове **дому друку ў Менску**, дзе прагрэсыўна-прэміяльнай сыстэмай ахоплена 8 брыгад вядучых кваліфікацый. Брыгады каменшчыкаў перавыканалі нормы на 45 проц. **На пабудове інбынамбінату ў Воршы** перавыкананьне нормы дасягае 33 проц., на пабудове **шоўкавай фабрыкі ў Магілёве**— па брыгадзе каменшчыкаў-37 проц., штукатураў і песьляроў на 56 проц. На вучастку **вазнеду ў Менску** перавыкананьне нормы за апошні месяц склала па брыгадзе каменшчыкаў -60 проц., песьляроў-20 проц., сталяроў-18 проц. Значна ўзрасла зарплата. На пабудове дому № 1 у Менску заработак каменшчыка ў чэрвені складаў 5 руб. 34 кап. у дзень, у ліпені 6 р. 47 кап., жніўні—7 руб. 30 кап; песьляра адпаведна—4 руб. 75 кап.;4 руб. 91 кап., 6 руб. 51 кап. Па доме друку заработак за гэтыя тры месяцы павялічыўся па групе каменшчыкаў з 5 руб. 91 кап. да 8 руб. 13 кап

Менбуд вельмі пасьпяхова ўводзіць на сваіх пабудовах сыстэму штодзённых заданьняў брыгадам. У заданьнях рабочым на кожным відзе і працэсе работ указваецца норма штодзённай выпрацоўкі і тут-жа адзначаецца кантроль выкананьня, які ажыцьцяўляецца прарабам. Гэта сыстэма дае магчымасьць з максымальнай выразнасьцю прасачыць за ходам выкананьня норм. Такі-ж мэтад уведзен і на будаўніцтве шоўкавай фабрыкі ў Магілёве.

Адмоўным момантам трэба лічыць слабое ўкараненьне індывідуальнай зьдзельшчыны. Адзінай арганізацыяй, якая перавяла некалькі брыгад каменшчыкаў на індывідуальную зьдзельшчыну і гэтым дасягнула канкрэтных вынікаў і ва ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы, зьяўляецца другі вучастак вазнеду ў **Гомелі**. Першыя вопыты ў гэтым напрамку праводзяцца таксама і на будаўніцтве вазнеду ў **Менску**. Другія будаўнічыя арганізацыі нават не зрабілі спробы ў справе ўкараненьня індывідуальнай зьдзельшчыны.

Паказаныя даныя сьведчаць аб тым, што пры правільнай перабудове сыстэмы аплаты працы, дасягаюцца значныя посьпехі ва ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы, ліквідацыі ўраўніваўкі і абязьлічкі.

Трэба безадкладна разьбіць сьцяну коснасьці і раўнадушша, якія назіраюцца ў гэтым пытаньні з боку раду будаўнічых і саюзных арганізацый БССР. Прагрэсыўна-прэміяльная сыстэма аплаты на пабудовах поўнасьцю сябе апраўдала і капчатковае ўкараненьне трэба ўсямерна фарсаваць.

На працягу бліжэйшай дэкады ў Менску будзе склікана шырокая ўсебеларуская нарада гаспадарнікаў і прафсаюзнікаў, якая павінна будзе выразьніць рад пытаньняў, зьвязаных з перабудовай сыстэмы аплаты працы на аснове ўказаньняў тав. Сталіна.

Л. С.

Завод імя Ланцуцкага ня мае праграмы на чацьверты квартал

КІРАЎНІЦТВА АДДЗЕЛУ ЦЯГІ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ БЕСЬПЕРАБОЙНАЙ РАБОТЫ. ТРЫ ІНСТАНЦЫІ ЎЗГАДНЯЮЦЬ ВЫДАЧУ 5 КІЛЁ ДРОТУ

Гомельскі завод імя Ланцуцкага зьяўляецца адным з буйнейшых прадпрыемстваў БССР. Між тым, рад вытворчых непаладак, якія ёсьць на гэтым заводзе, зрываюць выкананьне прамфінпляну. Дагэтуль няма дакладнай праграмы; нават заводакіраўніцтва ня ведае, што павінен выпрацоўваць завод.

Аб становішчы, якое стварылася на заводзе, кіраўніцтва своечасова паведамляла вышэйшыя органы, але аддзел дырэкцыі цягі нічога ня робіць, каб наладзіць работу. Ён толькі стварыў камісію для праверкі становішча заводу. Нарэшце, пасьля паўторнай праверкі работы, камісія дала ўстаноўку, з якой згадзіўся аддзел цягі.

На падставе гэтага загаду заводакіраўніцтва 5 верасьня зрабіла заяўку на патрэбны матар'ял. Але ў той-жа дзень аддзел цягі прысылае новы плян, які зусім супярэчыць першаму. Новы плян патрабуе перапляніроўкі зборачнага цэху, які ня прыстасован да рамонту паравозаў магутных сэрый, а таксама перадзелкі матар'яльных заявак.

Аддзел цягі зусім бездказна прысылаў патрабаваньне—тэрмінова камандыраваць у Магілеў 25 чорнарабочых. Пасьлухмянае заводакіраўніцтва выконвае гэта галавацяпскае распараджэньне; здымае рабочых з дрэваапрацоўчай пабудовы і адпраўляе іх у Магілеў. Аддзел цягі ня мог на месцы знайсьці на 5 дзён такую «кваліфікаваную» рабсілу, як чорнаробочыя.

Ня лепш стаіць справа з рэканструкцыяй і капітальным будаўніцтвам заводу. Пачынаючы з 1929-30 году завод шпарка пашыраецца. З моманту пераходу заводу пад непасрэднае кіраўніцтва Зах. чыгунак усё будаўніцтва спыняецца і толькі зараз, пасьля настойлівых патрабаваньняў, аддал цягі дае санкцыю на гэту пабудову, але **матар'яльных фондаў не адпускае.**

У выніку посьпяга вырашэньня гэтага пытаньня і надахвату матар'ялаў, становішча з будаўніцтвам зараз пагражаючае. Апалубка і страпілы новых цэхаў, з прычыны адсутнасьці толю і жалеза, пачынаюць псавацца. Таксама затрымліваецца пабудова сталяліцейнай. Калі яна ня будзе скончана **да 15 сьнежня**, дык дырэкцыі прыдзецца плаціць няўстойку валютай **па 100 рублёў у дзень** нямецкай фірме, якая дастаўляе абсталяваньне.

Матар'яльны склад знаходзіцца на тэрыторыі Гомельскага раёну і для атрыманьня матар'ялу заводакіраўніцтва зварачаецца на склад. Загадчык складу просіць дазволу ў **НХ**; апошні запрашае дырэкцыю шляхоў і толькі тады канчаткова вырашаецца пытаньне. Ёсьць рад афіцтаў, **калі 5 кгр. дроту завод чакае на працягу месяца** (пры наяўнасьці дроту на складзе), пакуль тры інстанцыі «Узгадняюць» паміж сабою гэта пытаньне.

Сыстэма матар'яльнага забесьпячэньня заводу папаўняе агульны малюнак безгаспадарчасьці, бясплянавасьці і слабота кіраўніцтва і ні ў якім разе не забясьпечвае нармальнай работы заводу.

Усё гэта прывяло да таго, што магутны завод, які мае ўсе магчымасьці дапамагчы транспарту ўвесь час цягнецца ў хвасьце, **ня выконвае прамфінпляну трэцяга рашаючага году і ня мае канчатковай праграмы на 4-ты заключны год пяцігодкі.**

Мы патрабуем ад адпаведных арганізацый безадкладнага ўмяшаньня ў гэту справу. **Гомельскі завод павінен працаваць бяз усякіх перашкод.** Дырэкцыя шляхоў павінна **тэрмінова скончыць капітальнае будаўніцтва заводу.** Трэба зьмяніць усю сыстэму забесьпячэньня матар'ялямі і даць заводу канчатковы прамфінплян.

Ударнікі «Зьвязды»: **Журомскі, Курындзін, Кныш, Дубень, Зіноўчык, Вітаўтаў, Лізуноў, Тараноўскі, Лаппа.**

Брыгады глінакопаў імя т.т. Сталіна і Молатава перавыконваюць пляны

БАБРУЙСК. Рабочыя цагельні № 3 на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва дабіліся значных посьпехаў у рабоце. Ляпшэ 10 жніўня гадавы плян на абжыгу цэглы выкананы на 110 проц., а па сырцу—на 30 проц. У ліпені плян па абжыгу быў выкананы на 160 проц. У выніку пераходу на зьдзельшчыну зарплата глінакопаў павялічылася на 30 проц.

На цагельні № 2 брыгады глінакопаў імя Сталіна і Молатава павялічылі выпрацоўку гліны з 26.000 цаглін паводле пляну ў дзень да 35.000. Адзак, гэта ініцыятыва ня была падхоплена на іншых заводах і засталася нескарыстанай. Заводзкі трыкутнік бязьдзейнічае. Культурна-масавая работа не вядзецца. (БЕЛТА).

Заключан сацдагавор паміж цагельнікамі БССР і Заходняй вобласьці

На першай цагельні Белбудаб'яднаньня адбыўся ўрачыстае падпісаньне сацдагавору паміж цагельнікамі БССР і Заходняй вобласьці на лепшае выкананьне прамфінпляну.

Дагавор прадугледжвае рад важнейшых мерапрыемстваў па ліквідацыі прарыву ў керамічнай прамысловасьці, узьняцьці прадукцыйнасьці працы, паталеньні сабекошту, зьнішчэньні прагулаў, паляпшэньні бытавых умоў і г. д.

Арбітрам абрана «Зьвязда».

Г. ДОРСКІ.

Гомельскія швэйнікі далі сустрэчны

На Гомельскай швэйнай фабрыцы «КАМІНТЭРН» прапрацоўка кантрольных лічбаў на 4-ы квартал прыходзіла пры актыўным удзеле рабочых. Пр прапрацоўцы былі ўзяты **СУСТРЭЧНЫЯ АБАЯЗЬЦЕЛЬСТВЫ** для пакрыцьця запазычанасьці па 3-м кварталe, у сувязі з прарывам на фабрыцы. Для поўнага ліквідацыі прарыву пастаноўлена ўжываць **ЗЬМЕННА-СУСТРЭЧНАЕ ПЛЯНАВАНЬНЕ.**

Рабочыя ўказалі на рад тормазаў у выкананьні прамфінпляну. Напрыклад па 4-й групе адзначана недастатковая гібкасьць з боку інструктара по ўвязцы. Па талстовачным цэху—**недастатковая ўвага** да работы цэху з боку ўсіх фабрычных арганізацый.

Групавыя сходы рабочых па абгаварэньні кантрольных лічбаў пастанавілі перавесьці **НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗЬЛІК** адну групу па шапачным цэху, адну па цэху моладзі і дзьве групы па бручна-баваўняным цэху.

Трэба адзначыць, што адміністрацыйна-тэхнічны персанал цэхаў недастаткова прымаў удзел у прапрацоўцы кантрольных лічбаў. Па паасобных групах, пры прапрацоўцы, адсутнічалі інструктары і загадчыкі цэхамі. **Д.**

ДВУХМЕСЯЧНІК ПРАВЕРКІ
РЭАЛІЗАЦЫІ АДОЗВЫ ЦК і СНК АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

КАМУНАРЫ „АВАНГАРДА“ на справе разгортваюць жывёлагадоўлю

Камуна „Авангард“ пашырае сваё стада

Камуна «АВАНГАРД» Мазырскага раёну можа паспужыць прыкладам для раду калгасаў Беларусі ў галіне разгортваньня жывёлагадоўлі. Стада камуны пашыраецца за кошт маладняка лепшай пароды.

У камуне «Авангард» зараз ёсьць 56 кароў чырвона-нямецкай пароды, маладняка ад 2-х да 3-х год—6 штук, ад 1 да 2 год—30 штук і ад 6 месяцаў да 1 году—30 штук.

На малочнай фэрме працуюць 4 пастаянныя дойкі і скотніцы. Працуюць яны зьдзельна і выпрацоўваюць штодзенна на 1¹/₄працадні. За каровамі вельмі добры догляд. Пры аборы ёсьць спэцыяльная кухня, дзе гатуюць харчы для жывёлы і грэюць ваду для цялят.

Ня меншае значэньне надаецца ў камуне і сьвінагадоўлі. На сьвінагадоўчай фэрме ўжо ёсьць значнае стада—105 сьвіноматак, 150 падсьвінкаў ад 6 месяцаў да 2 год і 66 парасят ад 2 да 6 месяцаў. Дзякуючы добраму догляду, усё стада захоўваецца і гадуецца.

Зараз заканчваецца пабудова сьвінарніка на 98 сьвіноматак.

Для папаўненьня балянсу сакавітых кармоў, камунары зьвярнулі належную ўвагу на сілас. Ужо закладзена звыш 100 тон сіласу.

Такім чынам дзякуючы добрай арганізацыі працы, увядзеньню сапраўднай зьдзельшчыны ў аборах і сьвінарніках, прымацаваньню да жывёлы пастаянных брыгад і арганізацыі прэміяльнага догляду і кармленьня, камуна «Авангард» дабілася значных посьпехаў у пашырэньні свайго стада.

Брыгада «Зьвязды»: КУЗЬМЯНОК, ЛУК'ЯНАЎ, СТРЭЛЬЧЫК і МІЦКЕВІЧ.

Зрух у камплектаваньні фэрм

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Уключэньне раёну ў двухмесячнік жывёлагадоўлі дало зрух у камплектаваньні калгасных фэрм. Калі на 1 верасьня ў малочных фэрмах было 900 кароў, дык на 20 ужо было—1.189 і на 30—1.349, або 91,8 проц. пляну камплектаваньня.

Камплектаваньне МТФ за апошні час праводзіцца за кошт неагрэмаджаных раней кароў, згодна статуту с.-г. арцелі і за кошт абмену бычкоў. Так, напрыклад, МТФ калгасу **«Камуніст»** абменяла бычкоў на 10 кароў.

Пасунулася ўперад і камплектаваньне сьвінагадоўчых фэрм. Калі на 1-га верасьня плян камплектаваньня СТФ быў выкананы на 29 проц., дык на 30 мы ўжо маем 67 проц. У сьвінагадоўчых фэрмах ужо ёсьць 1.890 сьвіноматак. Калгасы **«Расьсьвет пераможца», «Чырвоная рудня»**, імя Войкава, **«На варце»**, і імя 12-ці **годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі** значна перавыканалі пляны камплектаваньня сьвінагадоўчых фэрм. Але побач з гэтым ёсьць яшчэ 18 калгасаў, якія не пачыналі нават камплектаваньня фэрм.

Значна горш з забесьпячэньнем фэрм кармамі. Дагэтуль яшчэ ня складзены кармовыя балянсы. Кармы не перададзены загадчыкам фэрм. У 10 сьвінагадоўчых фэрмах ужо выяўляецца недахоп кармоў. Але сілаваньне ў гэтых фэрмах амаль не праводзіцца.

А. М.

Зруйнаваць абязьлічку

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Ад наш. спэцыяльнага карэспандэнта). Мсьціслаўскі раён —жывёлагадоўча-ільнянога напрамку. Гэты ўхіл раёну выцякае з найбольшай эканамічнай выгоднасьці сумяшчэньня гэтых дзьвёх высока-таварных галін гаспадаркі. Абедзьве гэтыя галіны надзвычай важны для нашай краіны.

Але Мсьціслаўшчына ўсю ўвагу зьвярнула выключна на лён, **забываючы пра жывёлагадоўлю, пічачы яе пабочнай справай.**

Важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду аб жывёлагадоўлі не знайшлі свайго ўвасабленьня ў практычнай рабоце мсьціслаўскіх раённых арганізацый.

Да гэтага часу ні адзін калгас (фэрма) ня ўключыліся ва ўсебеларускі конкурс на лепшую калгасную таварную фэрму.

Абвешчаны ЦК КП(б)Б двухмесячнік жывёлагадоўлі таксама не знайшоў водгуку з боку мсьціслаўскіх раённых арганізацый.

Плян камплектаваньня малочных фэрм выканан на 66 проц., сьвінагадоўчых—на 20 проц.

Але самае сур'ёзнае становішча—гэта з кадрыхтоўкай да ўтрыманьня жывёлы ў зімовы перыяд. **Ня больш 40 проц. калгасных жывёлы забясьпечаны большыня прыстасаванымі памяшканьнямі.** Рэшта—гібне пад адкрытым небам.

У калгасе **«Серп і молат»** у пушчы, дзе стаяць сьвіньні,—не страха, а рэшата. З надыходам восені тут цэлая паводка. Такое-ж становішча і ў калгасе **«Пралетарская перамога»** і цэлым радзе іншых калгасаў.

У догляде жывёлы панае самая злачынная абязьлічка (калгасы: «Серп і молат», «Пралетарская перамога», «Івоны», «Асмолавічы»). Усё стада даглядае адна брыгада, на якой ляжыць кругавая адказнасьць. «Усе за ўсё адказваюць». А калі прыняць пад увагу, што склад брыгады зьмяняецца на месяц два-тры разы, дык стане ясным, **ШТО НІХТО НІ ЗА ШТО НЕ АДКАЗВАЕ.**

Уведзена «зьдзельшчына», якая не стымулюе ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы сьвінара, бо працу брыгады сьвінароў улічваюць пароўні ў канцы месяца.

Кулацкая ўраўніваўка знайшла сабе найлепшы прытулак. Ва ўсім раёне ня знойдзеш, дзе прэміявалі-б каго-небудзь з брыгады па жывёлагадоўлі, бо жывёлагадоўчыя брыгады, працуючы ў надзвычай цяжкіх умовах, **зарабляюць менш, чым палявыя брыгады.** Гэта лепш за ўсё сьведчыць аб тым, што справе жывёлагадоўлі ў Мсьціслаўшчыне не адводзіцца належнай увагі.

Цякучасьць складу брыгад, нізкая якасьць працы — вось вынік арганізацыйнай неўпарадкаванасьці калгасных фэрм.

Амаль у кожнай фэрме не хапае канцэнтраваных кармоў і толькі перавыкананьне пляну сілаваньня зможа выратаваць становішча. Але плян сілаваньня выкананы толькі на 35 проц. Загадчык райземчасткі тав. Шэвэльдзін нават хваліцца: «У нас вышэйшы процант выкананьня пляну сілаваньня, чым у суседніх раёнах».

Выходзячы з гэтага «благаславеньня» тав. Шэвэльдзіна, сілаваньне па раёне ідзе самацёкам. Бульбянік ня зжынаецца, **а проста заворваецца** пры выкацы (калгас «Шамоўшчына»), чым падрываецца галоўная база зялёнай масы.

Рад сельсаветаў у справе сілаваньня паказваюць яўную правазапартуністычную практыку. Так, Шыркаўскі сельсавет выканаў плян на 11 проц., Малькаўскі — на 6, Расьпянскі — на 5, а Захоцкі сельсавет — усяго на... 0 проц.

Мсьціслаўшчына не ўзяла бальшавіцкіх тэмпаў у разьвіцьці жывёлагадоўлі, а па-старому плыве па хвалях апартуністычнага самацёку. Неабходна ў самы найхутчэйшы тэрмін мабілізаваць раённы актыў і кінуць на ліквідацыю прарываў па жывёлагадоўлі.

П. А.

Фабрыка малака

Ня так даўно ў калгасе «САЦЫЯЛІЗМ» (Стара-Дарожнага раёну) арганізавалася МТФ. Ня гледзячы на кароткі час свайго існаваньня, калгасьнікі па-бальшавіцку змагаюцца за пераварэньне фэрмы ў фабрыку малака.

Фэрма гадавы плян укамплектаваньня выканала на 94 проц. На фэрме ёсьць 165 кароў.

Усё паступаючае малако накіроўваецца ў райкаапсаюз. Ні аднаго літра малака не разбазарваецца. У ВЫНІКУ — НА 9 ВЕРАСЬНЯ ПЛЯН ЗДАЧЫ МАЛОЧНАЙ ПРАДУКЦЫІ ВЫКАНАН НА 280 ПРОЦ. Паводле кантрактацыйнага дагавору з райкаапсаюзам ПАТРЭБНА БЫЛО ЗДАЦЬ 15.000 ЛІТРАЎ МАЛАКА, ЗДАНА ФЭРМАЙ — 42.000.

Будуецца кароўнік на 100 галоў, які будзе мэханізаваны. Праз увесь карыдор кароўніка будзе праходзіць вагонэтка ад кормахаваньні да кожнага станка.

Плян будаўніцтва кароўнікаў выкананы толькі на 70 проц. Лесазавод «Пралетары» адмовіўся пры дапамозе калгаснай рабочай сілы расьпіліць дошкі для пабудовы. Трэба рашуча ўдарыць па кіраўніцтве заводу, якое зрывае плянавае будаўніцтва кароўніка.

Брыгадзір «Зьвязды» — БАРЫСЗВІЧ

МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ

Фінплян 3-га кварталу выканан на 87,4 проц.

УДАРНАЙ РАБОТАЙ У ЧАЦЬВЕРТЫМ КВАРТАЛЕ ПАКРЫЦЬ НЕДАБОР І ПОУНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ФІНПЛЯН!

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ВЫКАНАНЬНЯ ПРЫ СНК СССР АБ ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯНУ БЕЛАРУСКАЙ ССР, НІЖНЯ-ВОЛСКІМ КРАЕМ І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦЮ

МАСКВА. (ТАСС. Па тэлеграфу).

Заслухаўшы даклад старшыні СНК Беларускай ССР тав. **Гападзеда**, старшыні Ніжня-Волскага крайвыканкому тав. **Казлова**, прадстаўніка абласнога выканкому Заходняй вобласьці тав. **Доўгава** і судаклады прадстаўнікоў НК РСІ РСФСР тав. **Крывава**, Наркамфіну СССР тав. **Генкіна** аб ходзе выкананьня фінансавага пляну, Камісія выкананьня ўстанаўляе наступнае:

1 Выкананьне фінансавага пляну Беларускай ССР і асабліва Ніжня-Волскім краем і Заходняй вобласьцю праходзіць нездавальняюча (галоўным чынам за лік недавыкананьня пляну накапленьня прамысловасьці, недастатковага выкарыстаньня наяўных таварных рэсурсаў, зрыву па Ніжня-Волскім краі і Заходняй вобласьці мясцовых загатовак, слабай мабілізацыі сродкаў насельніцтва).

2. Камісія выкананьня асабліва адзначае, што пры ўзмацненьні тэмпаў работы па выкананьні фінансавых заданьняў у трэцім кварталe, у прыватнасьці па Беларускай ССР пры датэрміновым выкананьні радам раёнаў кантрольных фінансавых заданьняў (па БССР—Сіроцінскім, па Ніжня-Волскім краі—Нова-Нікалаеўскім, Сярэдня-Ахтубінскім і Міхайлаўскім раёнах; па Заходняй вобласьці — у Пагарэлаўскім, Бранскім, Смаленскім прыгарадным раёнах) плян мабілізацыі сродкаў ня выконваецца.

Мясцовымі арганізацыямі, у тым ліку і фінансавымі, не аддавалася выстарчальнай увагі паступленьню плацяжоў сельскага насельніцтва, у выніку чаго выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў на вёсцы значна адстае ад гораду.

Асабліва слаба праходзіць работа па паступленьні плацяжоў па самаабкладаньні, акцыях Трактарацэнтру, па мапыніных збавязацельствах, па паявых узносах у спажыўкаапэрацыі, па ўступных узносах у калгасы, а таксама па дзяржпазыках і ўкладах у ашчаджасы.

3. Камісія выкананьня ўказвае на неабходнасьць усямернага ўзмацненьня работы на адзначаных адстаючых вучастках, у прыватнасьці па зборы с.-г. падатку (Заходняя вобласьць), акладным страхаваньні, прампадатку, падаходным падатку (Ніжня-Волскі край, Заходняя вобласьць), па зборе с.-г. пазычак (БССР, Заходняя вобласьць), па зборы авансаў па сыстэме спажыўкаапэрацыі (Заходняя вобласьць).

Асабліва зварачаецца ўвага СНК БССР, выканкому Заходняй вобласьці на невыкананьне ва ўстаноўлены тэрмін заданьняў па спагнаньні з кулацкай часткі вёскі с.-г. падатку.

4. Адзначаючы слабасьць работы па мабілізацыі сродкаў насельніцтва з боку мясцовых органаў спажыўкаапэрацыі, прамкаапэрацыі, Трактарацэнтру, Хлебжыўёлацэнтру, Рыбаксаюзу і Ільнацэнтру, акцыянэрнага таварыства с.-г. забесьпячэньня, прапазваць СНК БССР, Ніжня-Волскаму крайвыканкому, Заходняму абласному выканкому ўзяць іх работу ў галіне мабілізацыі сродкаў пад асобны нагляд.

5. Канстатуючы наяўнасьць у БССР выпадкаў выдаткаваньня сродкаў, якія адпушчаны на капітальнае будаўніцтва, не па простым прызначэньні (Белторф), няправільную практыку некаторых аддзяленьняў Дзяржбанку (аршанскае), якія пералічваюць на эксплёатацыйныя рахункі сумы, што адпушчаны банкам доўгатэрміновага крэдыту на капітальнае будаўніцтва, прапанаваць Саюзторфу і Дзяржбанку накласьці спагнаньне на вінаватых, устанавіўшы ў далейшым належны кантроль за выдаткаваньнем сум, якія адпушчаны на капітальнае будаўніцтва.

6. Лічыць неабходным працягнуць работу Камісіі выкананьня па праверцы ажыцьцяўленьня фінансавых плянаў другімі саюзнымі рэспублікамі, краямі і вобласьцямі.

Старшыня Камісіі выкананьня
МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар Камісіі выкананьня
МЕЖЛАУК.

Масква, 5 кастрычніка.

Бярэце прыклад з лепшых

Паводле прапаноў раённых камісій садзейнасьці дзяржкрадыту, кіраўніцтва ашчаджас прэміявала наступных ударнікаў фінансавага фронту. Камісія садзейнасьці калгасу «НОВЫ БЫТ» (Старобінскага раёну) прэміявана сумай у 100 руб. за 100-проц. ахоп членаў калгасу пазыкай на суму ў 2.205 руб. (ў разьмеры трохтыднёвага заработку) і рэалізацыю пазыкі за наяўны разьлік на 400 руб.

Камісія садзейнасьці ЧАЧЭВІЦКАГА сельсавету таго-ж раёну прэміявана 100 рублямі за 100-проц. ахоп аднасобнікаў пазыкай у сярэднім 17 руб. на адну гаспадарку. Адначасова прэміруецца 50 рублямі старшыня гэтага сельсавету тав. ВАСЮКЕВІЧ за прыкладную арганізацыю кампаніі і актыўную работу па рэалізацыі пазыкі.

**ЛІСТАПАДАВІЦКІ ЛЕСРАБАЧКОМ прэміява

Год выданьня—XV
№ 273 (4179)
Серада, 7 лістапада 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА
Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,—сакратар—10-74, парт. сакратар—13-90, прамысл.—13-80, сель. гасп.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замест. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжгародняя інфармацыя—10-74, кантораўпр-ва—7-81, аддз. абвестак—7-81

Японскія крэйсэры і мінаносцы запоўняюць воды Кітая

Манчжурый пагражае лёс Карэі

Увесь Кітай ахоплен антыяпонскім рухам

ШАНХАЙ, 6. Антыяпонскі рух у Нанкіне ўзмацняецца. Па ўсім горадзе адбываецца старанны вышук японскіх тавараў. У некаторых кітайскіх магазынах пошукі прыводзяць да выяўленьня «варожых тавараў». У гэтых выпадках упасьнікаў такіх тавараў водзяць па ўсім горадзе спэцыяльныя студэнцкія дружыны. Тое самае адбываецца і ў іншых мясцох. Масавыя мітынгі адбываюцца кожны дзень у Чанша. У Кантоне ласьпя вялікага мітынгу тысячны натоўп прайшоў па вуліцах гораду. Ва ўсіх частках гораду адбываліся даклады і чыталіся пекцыі аб японскай імпэрыялістычнай агрэсіі. Тое самае адбываецца і ў некаторых іншых гарадох. У Сватоу натоўп гваптам закрыў кітайскія магазыны, што прадавалі японскія тавары. Кітайскія кулі адмовіліся грузіць і разгружаць японскія параходы. Кітайцы, якія гандлююць японскімі таварамі, затрымліваюцца.

Друк паведамляе, што антыяпонскі рух усё больш узрастае таксама і ў правінцыі Юнань. Адсюль японцы пачынаюць эвакуяваць на Хакоша (Інда-Кітай). Усюды антыяпонскія асацыяцыі выносяць патрабаваньні аб бязьпітасным пакараньні, нават сьмерцю, кітайскіх ган для роў, якія прадаюць японскія тавары.

Учора ноччу зноў прыбылі 4 японскія зьнішчыцелі, якія кінулі якар недалёка ад кітайскага берага. Другія тры зьнішчыцелі прыбылі ўчора ва Узун (гавань каля Шанхая). Узмоцнена цыркулююць чуткі, што ваенны экіпаж гэтых суднаў высадзіць дэсант на кітайскую тэрыторыю.

СТВАРАЕЦЦА АГУЛЬНА-МАНЧЖУРСКІ УРАД МАРЫЯНЭТАК

БЭЙПІН, 5. Як паведамляюць з Харбіну, у бліжэйшыя дні ў Мукдэне адкрываецца АГУЛЬНА - МАНЧЖУРСКІ ЗЬЕЗД НОВЫХ УРАДАЎ для стварэньня аб'яднанага «незалежнага» ўраду.

Амэрыканская газэта з трывогай канстатуе, што арганізацыя новага ўраду і ліквідацыя Гаміндану ў Манчжурыі, а таксама далучэньне харбінскіх улад да новага рэжыму прывядуць да панаваньня японскага ўплыву таксама ў Паўночнай Манчжурыі. «Камітэт па ахове парадку» ў Харбіне заявіў, што паліцыя па складзе будзе «міжнародная» (іншымі словамі, у яе будуць прымацца японцы і белагвардзейцы) і што ў задачы паліцыі будзе ўваходзіць БАРАЦЬБА З КАМУНІСТЫЧНАЙ ПРАПАГАНДАЙ. Паведамляюць, што японскае камандаваньне фармуе «незалежную» манголь скую армію для замацаваньня захопу Баргі. У конныя часьці прыцягнуты таксама РАСІЙСКІЯ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦЫ.

У КІТАІ УСЕАГУЛЬНЫ АНТЫЯПОНСКІ БАЙКОТ

ТОКІЁ, 5. У савеце міністраў, морскі міністар Або дакладваў аб разьмерах антыяпонскага байкоту ў Кітаі. Кітайскія параходзтвы і банкі ўжо адмовіліся прадаваць з японскімі фірмамі. Доці адмаўляюцца рабіць рамонт японскіх суднаў. Наогул японскія судны пазбаўлены магчымасьці закупляць патрэбнае для плаваньня абсталяваньне і снабжэньне. Банкі і гандляры адмаўляюць японскім рэзыдэнтам у сваіх паслугах. Такім чынам, эканамічная блёкада супроць японскіх рэзыдэнтаў у Кітаі паступова пашыраецца. Або заявіў, што неабходна адправіць у Шанхай браняносец і ўказаў, што «морскія ўлады гатовы адправіць у кітайскія воды, у выпадку патрэбы, магутную эскадру і некалькі дэсантаў морскай пяхоты».

Прадстаўнікі ПАЗШ „вывучаюць"

ШАНХАЙ, 5. Паводле паведамленьня з Нанкіну, нанкінскі ўрад зьвярнуўся да ўраду ПАЗШ з просьбай назначыць прадстаўнікоў для вывучэньня манчжурскага пытаньня да 14-га кастрычніка, калі мяркуецца адкрыцьцё савету Лігі Нацый.

„Салдаты" і дыплёматы

ТОКІЁ, 5. Згодна паведамленьня газэты «Асахі», міністэрства замежных спраў гатова прыступіць да перагавораў па манчжурскіх пытаньнях з нанкінскім урадам, у той час, як японскія вайсковыя колы рашуча супярэчаць супроць гэтага, лічачы найлепшым шляхам рэгуляваньня манчжурскіх пытаньняў у перагаворах «з мясцовым моцным урадам», з прычыны таго, што нанкінскі ўрад застасоўвае да Японіі ўсе сродкі варожасьці, за выключэньнем адкрытых ваенных дзеяньняў.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

Нездавальняючыя вынікі верасьня патрабуюць максымальнага ўзмацненьня тэмпаў загатовак ў кастрычніку

Ворша і Крупкі павінны рашуча падцягнуцца

Масавая робота—на апошнім пляне

Збожжазагатоўчая кампанія па Крупскім раёне праходзіць самацёкам. Раённыя загатоўчыя арганізацыі і сельсаветы на мясцох не мабілізавалі працоўную грамадзкасьць на своячасовае выкананьне пляну здачы збожжа. Масавая работа сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў амаль зусім адсутнічае.

На 1-га кастрычніка гадавы плян па раёне выкананы толькі на 17,7 проц.

Зусім дрэнна спатаняецца збожжа з кулакоў і заможнікаў па цьвёрдых заданьнях. На 1-га кастрычніка кулацка-заможныя гаспадарні здалі ўсяго 636 цэнтн. збожжа. Горш за ўсё тое, што да гэтага часу няма пляну здачы збожжа кулакамі. Раённыя арганізацыі ня здолелі наладзіць належным чынам улік загатовак.

Аймор.

„У нас няма лішкаў, мы самі ўсё выдаткоўваем"

СЛУЦАК. (Наш кар.).

У калгасе імя Карла Маркса, Ленінскага сельсавету, збожжазагатоўчая кампанія пад патрозай. Кіраўніцтва калгасу заражана кулацкімі спажывецкімі настроямі. Старшыня калгасу заяўляе:

— У нас няма лішкаў збожжа, мы самі ўсё выдаткоўваем.

У выніку гэтых шкодных настрояў калгас на сёньнішні дзень ня здаў яшчэ ніводнага цэнтнэра збожжа.

Райкалгасаюз павінен зараз-жа праверыць работу кіраўніцтва калгасу і прыцягнуць вінаватых у зрыве збожжазагатовак да суровай адказнасьці.

П. Н.

Цьвёрдыя заданьні спаганяюцца зусім слаба

ВОРША. (Наш кар.).

Аршаншчына дагэтуль яшчэ не разгарнула па-баявому збожжазагатоўчую кампанію. Гадавы плян на 1 кастрычніка выкананы на 38,6 проц. Асабліва адстаюць сельсаветы: Астапенскі — 8 проц. пляну, Кудаеўскі—8,5 проц.

Упередзе ўсіх ідзе Пугляеўскі сельсавет, які на 25 верасьня выканаў 56,3 проц. заданьня.

У некаторых сельсаветах мела месца сказаўленьне клясавай лініі па гадавым цьвёрдых заданьняў. Так, у Крапівенскім сельсавеце цьвёрдыя заданьні былі даведзены да беднякоў. Зараз гэтыя памылкі выпраўлены і вінаватыя прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

Вельмі дрэнна спатаняецца збожжа з кулацка-заможных гаспадарак па цьвёрдых заданьнях. Райснаб на сёньнішні дзень нават ня ведае, колькі збожжа здалі кулацка-заможныя гаспадаркі і колькі яны павінны здаць.

Авел.

Здатчыкі чакаюць разьліку па 15—20 дзён

МАГАЛЕЎ. (Наш кар.).

Тры сельсаветы Магілеўшчыны, у выніку ўдарнага разгортваньня збожжазагатоўчай кампаніі дабіліся вялікіх посьпехаў у здачы збожжа. Вендароскі сельсавет на 4 кастрычніка выканаў гадавы плян збожжазагатовак на 65 проц. Мастоцкі і Цішаўскі сельсаветы —звыш 55 проц.

Значная частка сельсаветаў раёну недапушчальна адстае. Гэта— Дасовіцкі, Хрыпляёўскі, Палыкавіцкі, Навасельскі, Добрасьневіцкі і інш. сельсаветы. У выніку агульны гадавы плян па раёне выкананы толькі на 20 проц.

У радзе месц дагэтуль яшчэ не адкрыты прыёмачныя пункты. Там-жа дзе яны існуюць, не паладжана належным чынам абслугоўваньне здатчыкаў.

Разьлік са здатчыкамі збожжа робіцца не раней, як праз 15-20 дзён пасьля прыёмкі. Гэта значна тармозіць здачу збожжа па самаабавязацельствах і кантрактацыі.

Ул. Марскі.

Бура крызісу зьмяце сьвет капіталу

Сацыял-фашысцкія лекары ў паніцы шукаюць сродкаў ратаваньня сьмяротна-хворага капіталізму

„Рэцэпт" супроць буры рэвалюцыі

ВЕНА, 2. З Бухарэсту паведамляюць, што на пасяджэньні міжпарляманцкай уніі выступіў з вялікай прамовай старшыня нямецкага рэйхстагу, САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТ ЛЕБЭ, які заявіў, што най больш рацыянальным вырашэньнем сусьветнага гаспадарчага крызісу зьявіўся-б мытны саюз паміж Францыяй і Нямеччынай, прычым ён быў-бы выходным пунктам для эканамічнага пан-эўрапэйскага саюзу. Вітаючы наведваньне французкімі міністрамі Бэрліна, Лебэ заявіў, што калі ня будзе ажыцьцёўлена неадкладнае вырашэньне эканамічнага крызісу ў Эўропе, дык «БУРА КРЫЗІСУ ЗЬМЯЦЕ ПРЭЧ УВЕСЬ НАШ СЬВЕТ».

Назначаны выбары ў ангельскі парлямэнт

ЛЁНДАН, 6. Як паведамляе Рэйтэр, габінэт прыняў ПАСТАНОВУ АБ НАЗНАЧЭНЬНІ ЎСЕАГУЛЬНЫХ ВЫБАРАЎ. Паводле вестак Рэйтэр, Макдональд у маніфэсьце ад імя «нацыянальнай каліцыі» будзе патрабаваць прадстаўленьня будучаму ўраду паўнамоцтваў для ўсіх неабходных мерапрыемстваў.

„Калі ня здарыцца, нешта надзвычай рашучае..."

БРУСЭЛЬ, 2. Цэнтральны орган бэльгійскай сацыял-дэмакратыі «Пэпль» паведамляе, што старшыня ангельскага банку Норман заявіў у лісьце да выдатнага бэльгійскага фінансіста Франкі, што «калі ня здарыцца нешта надзвычай рашучае, капіталізм павінен у хуткім будучым, у працяку нават бліжэйшага году канчаткова рухнуць».

Гутаркі і справы здрадзікаў на канфэрэнцыі лейбарыстскай партыі

СКАРБОРО, 5. Адкрылася канфэрэнцыя лейбарыстскай партыі. Выступіўшы на канфэрэнцыі Гендэрсон з першых-жа слоў падкрэсьліў, што канфэрэнцыя павінна не займацца гутаркамі аб мінулым, а згуртавацца далкам на падрыхтоўцы да ўсеагульных выбараў. Гендэрсон прапанаваў скарачыць час работ канфэрэнцыі, заяўляючы, што патрэбны «ня гутаркі, а справы». Сэкс гэтай заявы заключаўся ў тым, каб не дапусьціць крытыкі былога лейбарыстскага ўраду, а абмежаваньнем будучай палітыкі лейбарыстскай партыі.

Настрой канфэрэнцыі, у агульным,— прыгнечаны, у сувязі з нерспэктывамі выбараў, якія, па агульнай думцы дэлегатаў, будуць праходзіць у нясприяючай для лейбарыстаў абстаноўцы. Для таго, каб уніцыць крытыкі палітыкі лейбарыстскага ўраду, пастаноўлена справаздачу выканкому зацьвердзіць амаль без заслухоўваньня, прадставіўшы на абгаварэньне справаздачы толькі тры гадзіны. Бракуэй ушёс прапанову адхіліць разьдзел справаздачы, прысьвечаны індыі, у знак пратэсту супроць таго, што лейбарыстскі ўрад дапускаў расстрэлы і няволю у турмах міруцкіх рэвалюцыянэраў і інш. дзеячоў індыйскага рабочага руху. Пры агульным галасаваньні прапанова Бракуэя была прынята. Тады прэзыдыум патрабаваў, каб галасаваньне было зроблена па арганізацыях і партыйныя бюракраты адхілілі прапанову большасьцю 1.500.000 галасоў супроць 677.000.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Пушчана першая турбіна БРЭС (у Бранску). Турбіна, пабудаваная ў асноўным, як ўсё абсталяваньне БРЭС, на савецкіх заводах, пушчана і працуе без перабояў.

Заканчваецца выраб электрычнага прыводу для першага савецкага блюмінга на заводзе «Электрасіла» (Ленінград). Прывод выпушчан амаль на два месяцы раней тэрміну—у 3 з паловай месяцы, у той час, як амэрыканская фірма «Дрэнэраль Электрык Компані» выбраляе прывод такой-жа магутнасьці ў працягу 5-6 месяцаў.

Першы па Украіне баваўна - ачышчальны завод пачаў працаваць у Генічэску.

Праект будаўніцтва заводу піпучых машын у Ленінградзе канчаткова зацьверджан ВСНГ РСФСР.

Халоднае і дажджлівае надвор'е на працягу апошняй дэкады трымаецца ў Крыме. Тэмпэратура паветра ўпала нізьвычайна для гэтага часу пізка—5-15 градусаў.

Жорсткі шторм на Ахоцкім моры зрабіў разбурэньні ў Рыбнаўскім раёне Сахаліну.

Абвешчана пазыка і выдана прэмія ў разьмеры 15 тыс. рублёў прызыдымам ВСНГ СССР амэрыканскаму горнаму інжынэру Говарду Макдональду за ўвядзеньне ў СССР амэрыканскіх сыстэм горных распрацовак, якія даюць дзякуючы зьніжэньню сабекошту значную эканомію.

Трэці том пасьцітомікі твораў Леніна на цюркай мове выпушчан інстытутам імя Шаўмана і Азэрнешпром. Заканчваецца пераклад яшчэ двух томаў.

Фота-апараты—працоўным

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР пра рэалізацыю фотаабавязацельстваў

Падкрэсьліваючы асаблівае значэньне выпуску фотаабавязацельстваў для разьвіцця прамысловасьці, якая выробляе фотаапараты, і падняцьця культурнага ўзроўню працоўных, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Зацьвердзіць кантрольную лічбу па рэалізацыі фотаабавязацельстваў у БССР у колькасьці 1.5000, з якіх на вёсцы 3.750 і ў горадзе 11.250.

2. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў на працягу 3-х дзён разьмеркаваць кантрольныя лічбы па паасобных сэрыях і давесьці іх да раёнаў.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў, кіраўніцтву ашчадных кас і дзяржаўнага крэдыту БССР пры дапамозе грамадзкіх арганізацый неадкладна разгарнуць шырокую папулярызацыю выпуску фотаабавязацельстваў.

4. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам устанавіць пастаянны нагляд за ходам кампаніі, прыцягнуць усю грамадзкасьць да рэалізацыі фотаабавязацельстваў і забясьпечыць пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне вызначаных раёнам кантрольных лічбаў.

5. Даручыць Белкалгасцэнтру даць паказаньні ўсёй калгаснай сыстэме аб распаўсюджаньні сярод калгасьнікаў фотаабавязацельстваў і аказаньні кіраўніцтвамі калгасаў усямернай дапамогі ашчадным касам у гэтай працы.

6. Прасіць ЦСПСВ забясьпечыць актыўную дапамогу з боку прафесыянальных арганізацый ашчадкаму апарату ў рэалізацыі фотаабавязацельстваў.

7. Даручыць цэнтральным і мясцовым газэтам шырока і ўсебакова папулярызаваць і асьвятляць на старонках друку кампанію па рэалізацыі фотаабавязацельстваў.

Старшыня Савету Народных Камісараў М .ГАЛАДЗЕД.
Нам. кіраўніка спраў СНК і Эканомсавету БССР Л. ДУБАВІЦКІ.

Да 14-й гадавіны кастрычніка

Скончыць пабудову элеватара ў Гомелі

ГОМЕЛЬ. Будаўніцтва новага магутнага элеватара ў Гомелі праходзіць узмоцненымі тэмпамі. Корпус элеватара выводзен. Распачаўся мантаж. Работа тармозіцца з-за недахвату цесьляроў, а таксама некаторых матар'ялаў, як дахавага жалеза, швэлера і г. д.

Амаль скончана пабудова абодвух паверхаў тарнага складу. Распачата будаўніцтва пляцоўкі, якая будзе прыстасована для разгрузкі гужам і вагонамі. Вядзецца работа па пракладцы чыгуначнай веткі.

Падрыхтавана памяшканьне для электрычнай падстанцыі. Далейшая работа затрымліваецца з-за недахвату цесьляроў.

Самае вузкае месца — упарадкаваньне дарогі да элеватара. Дарога, якая існуе, незабрукаваная і з наступленьнем разводзьдзя непьга будзе падаваць грузы гужам. Такое становішча можа выклікаць зрыў у загрузцы складу і элеватара. Будаўнічыя арганізацыі бязьдзейнічаюць. Працдысцыпліна сярод будаўнікоў ня вельмі высокая.

Элеватар мяркуецца пусьціць да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Патрэбны тэрміновыя меры для ўпарадкаваньня дарогі, забясьпечэньня цесьлярамі і навулл фарсаваньня будаўніцтва.

ЧЫРВ. ЗОРКА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Новы замежны фільм СЫН ЗОРА у 8 ч. у гал. ролі Дуглас Фэрбэнкс
„КУЛЬТУРА" Пач. 7, 8-45, 10-30 — Новы фільм вытворч. «Межрабпомфільм» КАНЕЦ ДЗЕРАГІНА. Звыш прагр. „Гордасьць Трэцяга Рашаючага".
Інтэрнацыянал Адкрыт з 12 г. дня — Мастацкі фільм ЛЕДЗЯНЫ ЛЁС Звыш прагр. дзячы хроніка
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — ГАРЫЗОНТ 555 у 7 част. Звыш прагр. „ПРАВДА" у МАСЫ у 1 ч.
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм ТАРАС ТАРАСІЛА Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 г. Ка са адкрыта з5 г. — З 1-га кастрычніка—баявік РЭЙНСКІ БУНТАР драма ў 7 частках.

Беларускі Дзяржаўны Тарфяны Інстытут
абвяшчае, што пачатак заняткаў на 3-м курсе эксплёатацыйнага аддзяленьня
15 кастрычніка 1931 г.

СТАРА-БАРЫСАЎСКІ СЬВІНАГАДОЎЧЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае прыём на 9-месячныя КУРСЫ тэхнікаў-сьвінаводаў.
Пачатак заняткаў 25 кастрычніка.
Без іспытаў прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 6 клясаў сярэдняй школы.
Патрэбны дакументы: 1) аб становішчы. 2) аб праве голасу, 3) аб узросьце, 4) аб сак. адукацыі, 5) аб здароўі. Пажадана рэкамэндацыі і камандыроўкі.
Умовы вучобы: усім—стыпэндыя 85 руб. і інтэрнат.
Заявы падаваць па адрасе: г. Барысаў, Стара-Барысаўскі с.-г. тэхнікум.
Дырэктар Я. ЛЕНЬКОЎ.

Да водама членаў цэнтральнай камісіі па складаньні другой пяцігодкі.
9 кастрычніка, у 10 гадз. раніцы, у габінэце старшыні дзяржпляну адбудзецца
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ ПА ПЯЦІГОДЦЫ.
У парадку дня:
1) Вынікі праробленай працы (першыя намёткі пляну электрыфікацыі). 2) Аб рабоце сэкцый цэнтральнай камісіі. 3) Плян далейшай работы.
Прысутнасьць членаў камісіі абавязкова.
Старшыня Дзяржпляну
Старшыня Цэнтральнай Камісіі
ШАПІРА.

10-га кастрычніка г. г., у памяшканьні залі пасяджэньняў ЦСПСВ (Дом Працы, 2-гі паверх., пакой № 10) адбудзецца
III ПЛЕНУМ ЦП САЮЗУ РАБОЧЫХ МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ І БАТРАЦТВА.
На пленум запрашаюцца ўвесь прафактыў гор. Менску і кіраўнікі гаспадарчых арганізацый якія ўваходзяць у сваю МТС і батрацтва.
Прыяжджаючыя дэлегаты з раёнаў разьмяшчаюцца ў ЦД Калгасьніка (рог вул. Карла Маркса і Чырвонаармейскай).

ПРАУЛЕНЬНЕ МЦРК паведамляе, што прыём грошай ад калектываў на бульбу і гароднінну ПРАДОЎЖАН
Талёны будуць выдавацца на атрыманьне бульбы і гароднінны тым, якія не атрымалі па 1-й падпісцы.
Водпуск бульбы і гароднінны па новай падпісцы будзе праводзіцца пасьля выдачы па 1-й падпісцы.
Парадак атрыманьня талёнаў і норны ранейшыя; рабочым—на 4 руб., служачым на 2 руб. і ўтрыманцам, калі яны пайчыкі, на 2 руб.

АДЗНОКЯ жаночыя шуба невялікі асобны пакой у самч. Пасьпадзіць пісьмова па адрасе: Савецкая, 55, кв. 6 ця с.
МЯНЮ пакой у Гомелі ў цэнтры, 5 пал. кв. с. на пакой у Менску. Звярнацца: у Менску—Беларуская Слабада, 13—1, у Гомелі—Кавпрацьбінка, 74-і.
МЯНЯЮ пакой у Менску, 2-гі паверх, 3 з усімі выгодамі. За даведкамі звярнуцца: Нарыкамысьветы, Мэтадком, Барыцэўская 3 2 да 4 гадз. дня.
КУПЛЮ шафу люстраную, гарнітур мягкай мэблі, добры ложак з матрацам і крамарны ўмывальнік. Прапановы па тэлеф. 17-56 і 44.

Кошт публікацыі аб згубе дакумэнту 1 руб.

Менск, друкарня «Зьвязда».

Сьвет працы палае пратэстам

супроць катаваньняў і зьдзекаў над палітвязьнямі ў польскіх турмах

Рабочыя машынабудаўнічага заводу «Пралетары» (Гомель) на сваім заводзкім мітынгу салідарнасьці з барацьбой дзесяці тысяч палітзьняволеных Польшчы прынялі наступную рэзалюцыю:

«Усеагульная дэманстрацыйная галадоўка палітычных зьняволеных у польскім турмах скончылася, але барацьба працягваецца.

Дзесяць тысяч лепшых сыноў рабоча-сялянскай сям'і крыкнулі на ўвесь сьвет аб тых зьдзеках, якія над імі творыць дыктатура катаў.

Дарагія таварышы палітычныя вязьні!

Ваш голас пачуты. Па ўсім сьвеце коціцца хваля баявой пралетарскай салідарнасьці. Пралетары Нямеччыны, Францыі, Аўстрыі і Амэрыкі ўздымаюцца на абарону зьняволеных братоў. Гневам і нянавісьцю да крываваай дыктатуры польскага фашызму палаюць шматтысячныя калёны сусьветнага пралетарыяту.

Барацьба 10.000 рэвалюцыянэраў — справа рабочых і сялян усяго сьвету. Няхай аб гэтым не забывае Піпсудзкі і яго крывавая зграя палкоўнікаў і генэрапаў.

Няхай-жа яшчэ мацней грыміць голас пратэсту сьвету працы! Няхай дрыжыць перад воляй сталёвых пралетарскіх капён сыстэма Луцкаў і сьцены яе бастыляй: Павіякаў, Лукішак, Брыгідак.

Канкрэтным выяўленьнем таго гневу, якім кіпяць да польскіх катаў працоўныя Савецкага Саюзу, будзе шырокая акцыя матар'яльнай дапамогі зьняволеным рэвалюцыянэрам.

У адказ польскім фашыстам мы, рабочыя заводу «Пралетары», аддамо ўсе свае сілы на выкананьне баявых задач 4-га кварталу трэцяга рашаючага і ўступаем усе, як адзін, у рады арганізацыі пралетарскай салідарнасьці — МОПР'у.

Прэч дыктатуру польскага фашызму!
Няхай жыве КПП — арганізатар польскага Кастрычніка!»

* * *

Рабочы калектыў саўгасу «Вузьдзянка» (Вузьдзенскі раён) уздымае свой голас пратэсту супроць зьдзекаў, якія творацца над зьняволенымі рабочымі і сялянамі за сьценамі польскіх турмаў.

У адзнаку рэвалюцыйнай салідарнасьці з барацьбой зьняволеных рэвалюцыянэраў мы адлічаем 180 руб. у фонд дапамогі і заклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу рэшту саўгасаў нашага раёну.

* * *

Агульны сход калгасьнікаў калгасу «Іскра» (Плешчаніцкі раён) сумесна з аднаасобнікамі вёскі Русакі ганьбіць польскіх фашыстаў, якія крывава расправляюцца з безабароннымі палонымі — нашымі зьняволенымі братамі.

У знак нашай салідарнасьці з барацьбой палітычных вязьняў польскіх турмаў мы засеем адзін гэктар жыта ў фонд дапамогі, адлічаем у гэты-ж фонд 62 рублі і аддаем свой аднадзенны заработак на пабудову інтэрнацыянальнага дзіцячага дому для дзяцей палітзьняволеных.

Для пастаяннай дапамогі барацьбітом рэвалюцыі мы ўсе ўступаем у рады МОПР'у.

Пратэст польскіх рабочых у Дэтройце

(Злучаныя Штаты)

700 польскіх рабочых на мітынгу ў Рабочым клюбе прынялі энэргічную рэзалюцыю пратэсту супроць рэжыму ў польскіх турмах. Рэзалюцыя перасланa польскаму паслу ў Вашынгтоне.

Польскія рабочыя ў Дэтройце выклікаюць працоўныя масы да дэманстрацыі пратэсту супроць спробаў польскага фашызму зьнішчыць рэвалюцыйны авангард у Польшчы.

Перайсьці на зьдзельшчыну, правільна разьмеркаваць ураджай

Нядаўна закончыўся аб'яднаны пленум Аршанскага РК КП(б)Б і РКК-РСІ, на якім было заслухана пытаньне аб ходзе гаспадарча-палітычных кампаній і чарговых задачах райпартарганізацыі. Пленум адзначыў, што Аршанская раённая партыйная арганізацыя дабілася значных посьпехаў у справе разьвіцьця саўгаснага і калгаснага будаўніцтва. Зараз у раёне калектывізавана звыш 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Партыйныя арганізацыі раёну атрымалі значныя перамогі на фронце другой бальшавіцкай вясны. У параўнаньні з мінулым годам плошча пад яравымі пасевамі павялічана на 19 проц.

Аднак, у галіне калгаснага будаўніцтва па Аршаншчыне маюць месца сур'ёзныя прарывы, якія вынікаюць з таго, што ў радзе партыйных ячэек дырэктыва партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў праводзіцца ў жыцьцё надзвычайна марудна. Рад калгасаў яшчэ да гэтага часу не пераведзены на зьдзельшчыну, у некаторых пануе абязьлічка. Ня гледзячы на налічэньне вялікай колькасьці інструктарскага пэрсаналу ў райкалгасасаюзе, райза і МТС, у радзе калгасаў улік работы і маемасьці яшчэ не наладжан. Пераважная большасьць калгасаў яшчэ не падрыхтаваліся да разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю. Такое становішча мае месца ў Пішчалаўскім, Сталінскім, Пугляўскім і Кудаеўскім сельсаветах, дзе партыйныя ячэйкі не далі належнага адпору кулацка-заможным элемэнтам, якія, пралезшы ў калгасы, імкнуліся падарваць іх.

Побач з яўна «ляванцкімі» заскокамі (давядзеньне цьвёрдых заданьняў да маламоцных сераднякіх і нават бядняцкіх гаспадарак) у рабоце партыйных ячэек Крапівеньскага, Кудаеўскага і Ледняніцкага сельсаветаў мае месца правааапартуністычная практыка, якая выяўляецца ў недавыяўленьні кулацкіх гаспадарак. Зусім нездавальняюча праходзіць па гэтых сельсаветах спагнаньне абавязковых плацяжоў з кулацка-заможных гаспадарак, якія да гэтага часу выканалі цьвёрдыя заданьні толькі на 0,9 проц.

Пленум намеціў рад практычных мерапрыемстваў, накіраваных на замацаваньне калгасаў і далейшае разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва.

Н. Гафт.

Гаспадаром жыцьця і сьмерці вязьняў зьяўляецца ў Польшчы начальнік турмы

Права на такое беспраўе дае турэмны рэглямант

Новы турэмны рэглямант дае начальніку турмы права над жыцьцём і сьмерцю палітычных вязьняў. Рэглямант дае яму поўную неабмежаваную ўладу і няшчасны той вязень, які трапіць у яго няласку. Начальнік выпрашае, ці можа вязень сядзець у агульнай камэры, ці ў адзіночцы. Начальнік турмы мае права даваць вязьням усякія ільготы і пазбаўляць іх. Начальнік мае права накладаць дысцыплінарныя кары. Ад яго, дазволу залежыць, ці вязень мае права ўжываньня пісьмовых прылад, іншак, бібліятэкі, ці ён можа бачыць сям'ю, ці мае права атрымліваць перадачы. Начальнік мае права адмовіць у спатканьнях аж да трох месяцаў, ён мае права пасадзіць вязьня на хлеб і ваду на час да двух тыдняў. Вязень ня мае права скардзіцца на дысцыплінарнае пакараньне начальніка. Складаньне агульных скарг вязьням забараняецца. Індывідуальныя скаргі вязьняў так часта для іх рызыкоўныя, што яны ня могуць да іх зварачацца. Неадаволеная скарга будзе, як беспадстаўная, караецца дысцыплінар на начальнікам турмы.

Гэты рэглямант накіроваи выключна супроць палітычных зьняволеных, у якіх адбіраюцца ўсе правы, крывёю завяваныя яшчэ ў часы царызму. Аднак, палітычныя вязьні не дазволяць адабраць здабытых правоў.

Касьцёл і новы турэмны рэглямант

Гэтымі днямі ўваходзіць у жыцьцё новы турэмны рэглямант, які прыраўноўвае палітычных вязьняў да крымінальных. § 106 гаворыць: «У азначаныя гадзіны раніцай вязень устае, мыецца, прыбірае камэру, выносіць ночнае начыньне, стараннa яго чысьціць, а потым на сыгнал усе вязьні молацца паводле свайго вызнаньня пад наглядам турэмных дазорцаў». Увечары адбываецца вячэрняя малітва. У турэмных школах навука рэлігіі займае першае месца. Турэмны духоўны мае права наладжваць рэлігійныя гутаркі і г. д. і такім чынам рэбіць уплыў на зьняволенага. Ад яго «задаволеньня» вязьняні залежаць адносіны турэмных улад да апошніх.

Новы турэмны рэглямант адкрывае для ксяндзоў, папоў і інш. шырокае поле для ўсякіх зьдзекаў. Фашысцкі ўрад ня толькі катуе палітычных вязьняў фізічна. Ён стараецца ўвесьці поўную сыстэму маральных мучэньняў.

«Галодны» паход беспрацоўных на Лёндан

Дровы—Менску

127 вагонаў дроў ня вывезена са станцыі

АДНЭЙ З ПРЫЧЫН ПЕРАБОЯЎ У ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ МЕНСКУ ДРОВАМІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ДРЭННАЯ ПАДАЧА ПАРОЖНІХ ВАГОНАЎ НА МЕСЦЫ ПАГРУЗКІ ДРОЎ. МІЖ ТЫМ, МЫ МАЕМ РАД ФАКТАЎ, КАЛІ ПААСОБНЫЯ ЎСТАНОВЫ І АРГАНІЗАЦЫІ ЗЛАЧЫННА ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ РАЗГРУЗКУ ВАГОНАЎ З ДРОВАМІ. ВАГОНЫ СТАЯЦЬ ПА НЕКАЛЬКІ ДЗЁН НЕРАЗГРУЖАНЫМІ І НЯ МОГУЦЬ БЫЦЬ НАКІРАВАНЫ НА СТАНЦЫІ ДЛЯ ВЫВАЗКІ ДРОЎ.

ЗА ПЕРШУЮ ПЯЦІДНЕЎКУ КАСТРЫЧНІКА НА СТАНЦЫЮ МЕНСК ПРЫБЫЛА 515 ВАГОНАЎ ДРОЎ. НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ КАЛЯ 127 ВАГОНАЎ НЕ ЗАБРАНА ЎСТАНОВАМІ ПАСЬЛЯ ВЫГРУЗКІ.

НА СТАНЦЫІ МЕНСК З 27 ВЕРАСЬНЯ НЯ ВЫВЕЗЕНЫ ДРОВЫ, ЯКІЯ ПРЫБЫЛІ Ў АДРАСЫ НАСТУПНЫХ УСТАНОЎ: АБКАМТРЭСТ — 20 ВАГОНАЎ, ЭЛЬВОД — 30, АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА — 8, ФАБРЫКА «КАСТРЫЧНІК» — 3.

З І КАСТРЫЧНІКА ЛЯЖАЦЬ ДРОВЫ НАСТУПНЫХ АДРАСАТАЎ: МЦРК—15 ВАГОНАЎ, ШПАЛЕРНАЯ ФАБРЫКА—3, ФАБРЫКА «КАМУНАРКА»—2, ХЛЕБАЗАВОД—4, «ЧЫРВОНАЯ ЗАРА»—3, СПРАЎДОМ—3 І ЗАКРЫТЫ РАЗЬМЕРКАВАЛЬНІК МЭТАЛІСТАЎ — 6 ВАГОНАЎ.

ДРОВЫ ЛЯЖАЦЬ НА ПУЦЯХ ЧЫГУНКІ, РАСКРАДАЮЦЦА.

ТАКІЯ АДНОСІНЫ ДА ВЫВАЗКІ ДРОЎ З ЧЫГУНАЧНЫХ СТАНЦЫЙ ДА ХУТЧЭЙШАГА АСЛАБАНЕНЬНЯ ВАГОНАЎ ДЛЯ ПАГРУЗКІ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ЗЛАЧЫННЫМІ. ПРАКУРАТУРА ПАВІННА ЗАЙНЯЦЦА ГЭТАЙ СПРАВАЙ І ПРЫЦЯГНУЦЬ ВІНАВАТЫХ У НЕСВЯЧАСОВАЙ ВЫГРУЗЦЫ